

ІНВЕСТФОРУМ: ПАКАЗАЦЬ ВОПЫТ І ПРАПАНАВАЦЬ НОВАЕ 5

ЯК ЛЕЧАЦЬ ПАЦЫЕНТАЎ З ЦЯЖКІМІ ФОРМАМІ COVID-19 6



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 ЛІСТАПАДА 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 214 (29583)

Мясцовае самакіраванне +TV праграма

## КОРАТКА

- Віцебская гарбальніца № 1 вернецца да звычайнага рэжыму работы з 8 лістапада.
- **Расійская авіякампанія «Азімут» пачала выконваць палёты з Калугі ў Мінск.**
- Сусветныя цэны на прадукты харчавання дасягнулі максімуму з ліпеня 2011 года.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Маргарыта ДОСІНА, начальнік аддзела навукі Міністэрства аховы здароўя:**

*«Беларуская вакцына супраць COVID-19 пройдзе ўвесь аб'ём выпрабаванняў, неабходных для яе экспарту, але найперш мы павінны абараніць нашых грамадзян. На сёння атрыманы прататып вакцыны, адпрацаваны штамы каранавіруса, якія існуюць на тэрыторыі краіны. Па планах, да канца 2023 года яна павінна выйсці ва ўжытак. Вытворчасць доследна-прамысловай партыі плануецца да канца чэрвеня наступнага года, а далей — наступны этап, абавязковы для рэгістрацыі, — праведзенне даклінічных даследаванняў. Гэта дасць магчымасць праверыць бяспечнасць і эфектыўнасць атрыманай вакцыны. Сам напрамак вельмі неабходны краіне. Гэта дазволіць сфарміраваць навуковую школу. У выпадку аналагічнай сітуацыі, якая склалася цяпер з каранавірусам, нашы вучоныя змогуць хутка і эфектыўна адрэагаваць на новыя выклікі».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Любая канкурэнцыя, любыя погляды садзейнічаюць выпрацоўцы нармальных палажэнняў будучай Канстытуцыі»

### Рабочая група па дапрацоўцы Канстытуцыі прадставіла Прэзідэнту новы праект Асноўнага Закона нашай краіны



Фота БелТА.

**Напрамкі дзейнасці рабочай групы вызначаны ў пазамінулы чацвер, на першай сустрэчы з Прэзідэнтам Беларусі. Група займалася вырашэннем пытанняў, па якіх не прыйшоў да адзінага меркавання шырокі састаў Канстытуцыйнай камісіі. А менавіта: статус Усебеларускага народнага сходу і парадак яго фарміравання, пераразмеркаванне кадравых і кантрольных паўнамоцтваў паміж органамі ўлады, захаванне збалансаванасці дзяржаўнага апарату. І вось праз два тыдні кіраўніку дзяржавы прэзентавалі вынікі работы.**

«Нагадваю яшчэ раз тым, хто нас пачуе, — Канстытуцыйная камісія правяла пэўную работу, прапанавала свае варыянты. А сёння група спецыялістаў, рабочая група, як мы яе называем, створаная распараджэннем Прэзідэнта, працуе над шліфоўкай гэтай Канстытуцыі. Калі па-народнаму казаць, прапісвае гэту Канстытуцыю юрыдычнай мовай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Беларускі лідар ужо атрымаў новы варыянт праекта Канстытуцыі і азнаёміўся з ім. «Сёння паспрабуем паразмаўляць на тэмы, што з'яўляюцца вострымі і важнымі для нашай краіны. Самае галоўнае — паслухаем матывацыю тых ці іншых артыкулаў, якія мы выключаем з Канстытуцыі, і асабліва тых, што мы ўводзім новымі, — адзначыў Прэзідэнт. — Ёсць што ўжо абмяркоўваць».

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у мінулы раз была пастаўлена задача: адпрацаваць прынцыповыя пытанні, якія датычацца падрыхтоўкі канстытуцыйных змяненняў. Галоўныя з іх — замацаванне ролі Усебеларускага народнага сходу, пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж органамі дзяржаўнай улады, захаванне збалансаванасці дзяржаўнага апарату і іншыя.

СТАР. 2

# «РАЗАМ МЫ СТВАРЫЛІ ЎНІКАЛЬНУЮ ІНТЭГРАЦЫЙНУЮ МАДЭЛЬ»



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы. Сустрэча прайшла ў фармаце відэаканферэнцыі. У цэнтры ўвагі — асноўныя напрамкі рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады. У цэнтры ўвагі таксама былі вынікі гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі за 2020 год і студзень — чэрвень 2021 года, ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы. На парадак дня была вынесена Канцэпцыя міграцыйнай палітыкі Саюзнай дзяржавы, прысуджэнне Прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне навукі і тэхнікі ў 2021 годзе, выкананне рашэнняў Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы.**

Перад пасяджэннем Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін пагаварылі па тэлефоне. Таксама, адкрываючы пасяджэнне, Прэзідэнт Беларусі павіншаваў расіян з Днём народнага адзінства.

## Далейшае пашырэнне саюзнай інтэграцыі

«Саюзная дзяржава для Рэспублікі Беларусь — прыярытэт з прыярытэтаў. Разам мы стварылі ўнікальную інтэграцыйную мадэль, дзякуючы якой забяспечваюцца роўныя правы беларусаў і расіян, паглыбляецца эканамічнае ўзаемадзеянне. Мы актыўна супрацоўнічаем па розных напрамках і нацэлены на далейшае пашырэнне саюзнай інтэграцыі, абараняем адзінія для нашых брацкіх народаў гістарычныя і маральныя каштоўнасці», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сур'ёзнай праверкай на трываласць для адносін паміж нашымі краінамі стаў беспрэцэдэнтны знешні націск. Але можна з упэўненасцю канстатаваць, што краіны гэтую праверку вытрымалі. «Больш за тое, ***мы становімся ўсё мацнейшымі і мацнейшымі. Гэта пацвярджаюць даныя эканамічнай статыстыкі***. За дзевяць месяцаў бягучага года аб'ём саюзнага таваразвароту вырас больш як на трэць і дасягнуў 28 мільярдаў долараў», — сказаў ён.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, шматпланавы характар мае знешнепалітычнае ўзаемадзеянне. Беларусь і Расія выступаюць з адзіных пазіцый практычна па ўсіх сучасных праблемах на розных міжнародных пляцоўках. Асобна ён адзначыў шчыльнае супрацоўніцтва ў сферы абароны. «Як паказалі апошнія падзеі, рэгіянальная групоўка войскаў Саюза з'яўляецца надзейным шчытом бяспекі не толькі для нашых краін, але і для ўсёй постсавецкай прасторы. Мы не хаваем нашых намераў узмацняць гэтую групоўку», — падкрэсліў беларускі лідар.

## Перазагрузка сумеснай эканамічнай прасторы

Асобнай тэмай у саюзным будаўніцтве Аляксандр Лукашэнка назваў вырашэнне сацыяльных пытанняў, абарону інтарэсаў грамадзян. «Аднак жыццё не стаіць на месцы. Усе мы ў той ці іншай ступені ўсведамляем неабходнасць далейшага руху наперад па шляху саюзнага будаўніцтва. Тым самым забяспечваецца абарона інтарэсаў Беларусі і Расіі ў агульнасусветнай прасторы», — заўважыў ён.

СТАР. 2

## Тэндэнцыі



# Адкуль на Палессі барханы?

### Змяненне клімату і глабальнае пацяпленне: прычыны, наступствы, як з гэтым жыць беларусам

**У апошнія гады клімат на Зямлі прыкметна мяняецца: адны краіны пакутуюць ад анамальнай спякоты, іншыя — ад занадта суровых і снежных зім, нязвыклых для гэтых месцаў.**

Пра змены клімату: прычыны і наступствы нам расказаў **дырэктар Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі доктар фізіка-матэматычных навук Сяргей ЛЫСЕНКА.**

СТАР. 19

# «Любая канкурэнцыя, любыя погляды садзейнічаюць выпрацоўцы нармальных палажэнняў будучай Канстытуцыі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Але пры гэтым ні ў якім разе нельга разбурыць тую стройную, няхай нават жорсткую, сістэму ўлады, што існуе ў Беларусі. Як я сказаў, надышлі да гэтага пытання сур'ёзна, наколькі можам сёння», — дадаў Прэзідэнт.

Ён выказаў думку пра неабходнасць яшчэ адной сустрэчы з рабочай групай. І ўжо пасля праект вынесуць на разгляд шырокага саставу Канстытуцыйнай камісіі і ўсенароднае абмеркаванне.

«Некаторыя ініцыятывы Канстытуцыйнай камісіі вы не падтрымалі. Хацелася б, каб асабліва вы засяродзілі ўвагу на гэтым пытанні. Гэта добра, што ёсць разнастайныя погляды, але, пэўна, любая канкурэнцыя, любыя погляды, што маюць быць пры сутыкненні, садзейнічаць выпрацоўцы нармальных палажэнняў будучай Канстытуцыі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Толькі так, ён лічыць, мы выйдзем на годны праект Асноўнага Закона, які чакаюць людзі. «Мы ўжо разагрэлі наша грамадства, і людзі чакаюць новую Канстытуцыю. Але ёсць, зразумела, і тыя людзі, што прапаноўвалі, патрабавалі перамен. Я так разумею, яны ім ужо непатрэбныя і Канстытуцыя непатрэбная. Мы ж не для іх робім Канстытуцыю, а робім яе для большасці нашага насельніцтва. Але жыць па гэтым Асноўным Законе прыйдзецца ўсім грамадзянам Беларусі і тым, хто прыедзе ў Беларусь», — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт.

Ён пералічыў этапы, якія засталіся ў рабоце над Канстытуцыяй, — яшчэ адно пасяджэнне рабочай групы вузкім колам, разгляд канчатковага варыянта Канстытуцыйнай камісіяй, апублікаванне для народнага абмеркавання і вынясенне на рэферэндум.

**Марыя ДАДАЛКА.**

**• Каментарый у тэму**

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА,** які ўзначальвае рабочую групу па дапрацоўцы праекта Канстытуцыі, адзначыў на пасяджэнні, што прадстаўлены Прэзідэнту варыянт Асноўнага Закона — вынік дэталёвага, напружанага абмеркавання варыянта, распрацаванага Канстытуцыйнай камісіяй. Па яго словах, прапрацаваны кожны артыкул праекта, і нават пасля таго, як ён быў накіраваны кіраўніку краіны, абмеркаванне прадоўжылася, уносяцца асобныя дапаўненні і ўдакладненні.

«Па пытаннях Усебеларускага народнага сходу: рабочай групай сфармуляваны нормы, што вызначаюць статус, парадак фарміравання і паўнамоцтвы УНС, якія значна ўдасканалены ў параўнанні з праектам Канстытуцыйнай камісіі», — паведаміў Ігар Сергеенка на пасяджэнні.

У размове з журналістамі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта дадаў: артыкулы па тэме УНС неабходна будзе яшчэ ўзважыць, каб яго паўнамоцтвы не супярэчылі дзеянням іншых органаў улады, а сістэма была збалансаваная.

«Вялікі акцэнт быў зроблены на Усебеларускім народным сходзе, яго паўнамоцтвах. Гэты орган знойдзе сваё адлюстраванне ў Канстытуцыі і якіх дзяржавы. Разглядалася, хто можа быць абраны дэлегатам гэтага сходу і як зменіцца структура органаў улады ў краіне з улікам узмацнення ролі Усебеларускага народнага сходу», — удакладніў Ігар Сергеенка.

Па яго словах, рабочая група ўнесла прапановы ў 53 артыкулы і дадала некалькі новых. Кіраўнік групы заўважае: размова ішла і пра змены ў артыкулы, што датычацца выбарчай сістэмы, правоў і свабод асобы, патрабаванняў да парламента і Прэзідэнта.

Адпрацаваны пераходныя палажэнні Канстытуцыі: як краіна будзе жыць пасля прыняцця змен, як будуць дзейнічаць законы.

«Кіраўніком краіны пастаўлены задачы па дапрацоўцы па асобных кірунках, дашліфоўцы ў тым ліку і юрыдычных тэрмінаў, сутнасці канкрэтных артыкулаў Канстытуцыі», — паведаміў Ігар Сергеенка.

**Наталля КАЧАНАВА, Старшыня Савета Рэспублікі,** расказала журналістам, што на сустрэчы разглядаўся амаль падрыхтаваны праект Канстытуцыі.

«Абмяркоўвалі нюансы, што ўзніклі ў рабочай групы. Колькі б ні працаваў над гэтым праектам, кожны час узнікаюць пытанні, якія дадаткова патрабуюць абмеркавання, — дадала спікер верхняй палаты парламента. — Мы разумеем сваю адказнасць. Па гэтым законе будзем жыць не толькі мы, але і тыя пакаленні, што ідуць за намі».

Сярод прапанаваных навацый закона, якія яна вылучыла, — наданне канстытуцыйнага статусу УНС, пераход парламента на адну сесію ў год. «Гэта была наша ініцыятыва. У нас зараз дзве сесіі ў год праходзяць. Мы прапанавалі, каб у нас была адна сесія. Мы павінны працаваць амаль увесь год. Будзем пачынаць з трэцяга аўторка верасня і завяршаць у чэрвені. Амаль увесь год парламент будзе працаваць, займаючыся законапраектамі», — тлумачыць Наталля Качанава.

Па яе словах, Усебеларускаму народнаму сходу плануюць надаць паўнамоцтвы адмены рашэнняў дзяржаўных органаў, даваць згоду на назначэнне суддзяў і Старшыні Канстытуцыйнага Суда.

# «РАЗАМ МЫ СТВАРЫЛІ ЎНІКАЛЬНУЮ ІНТЭГРАЦЫЙНУЮ МАДЭЛЬ»

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

«***Па сутнасці, мы прыступаем да перазагрузкі сумеснай эканамічнай прасторы.*** Гэта ўкараненне сучасных тэхналогій, стыляў і метадаў прыняцця рашэнняў. Вынікам такой работы павінна стаць фарміраванне якасна новага асяроддзя абарачэння тавараў і паслуг, стварэнне аб'яднаных галіновых рынкаў, рэалізацыя адзіных фінансавай, падатковай, крэдытнай, прамысловай і іншых палітык», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што на новы ўзровень трэба вывесці супрацоўніцтва органаў дзяржаўнага кіравання, паставіўшы перад імі задачу вырашаць пытанні двухбаковых адносін у першачарговым парадку з улікам узаемных інтарэсаў.

«Разам з тым хачу перасцерагчы ўрады ад паглыблення ў тэорыю. ***Практычную аддачу ад прыманых рашэнняў мы павінны ўбачыць, што называецца, ужо заўтра.*** Перш за ўсё размова ідзе аб рэалізацыі буйных сумесных праектаў. Станоўчыя прыклады ў нас ужо ёсць, у прыватнасці, у сферах атамнай энергетыкі і асваення космасу. Ёсць у нас прадметныя дамоўленасці і па іншых перспектыўных кірунках сумеснай работы, якія мы ўжо неаднаразова абмяркоўвалі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## Наперадзе — вялікая работа

Прэзідэнт папрасіў Пасткам Саюзнай дзяржавы і асабіста яго кіраўніка Дзмітрыя Мезенцава гэтыя пытанні ўзяць на асаблівы кантроль.

«***Усе дамоўленасці прэзідэнтаў па такіх важных перспектыўных напрамках павінны быць фармалізаваны праз адпаведныя рашэнні саюзных органаў***», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што ўсе прынятыя дакументы, прынятыя ўчора, чарговы раз пацвярджаюць наяўнасць вялізнага патэнцыялу для далейшага развіцця Саюзнай дзяржавы.

«Наперадзе нас чакае вялікая работа, але, я ўпэўнены, усё намечанае будзе рэалізавана ў поўным аб'ёме на карысць нашых краін і народаў, што адпавядае мэтам і прынцыпам саюзнага будаўніцтва», — заявіў ён.

**На пасяджэнні Прэзідэнт Беларусі, Старшыня Вышэйшага Дзяржаўнага Савета Саюзнай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў дэкрэт ВДС «Аб Асноўных напрамках рэалізацыі палажэнняў Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы на 2021—2023 гады». Падпісаны дакумент быў папярэдне завізаваны Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным.**

**У саюзных праграмах дакладна прапісаны механізмы развіцця адзінай эканамічнай прасторы: фарміраванне аб'яднаных галіновых рынкаў, рэалізацыя гарманізаванай фінансавай, падатковай, крэдытнай, цэнавай, гандлёвай палітыкі. У дакументах таксама закладзены вырашэнне праблемы паставак у Беларусь энерганосьбітаў, рост аб'ёму транспартных паслуг, фінансаванне новых інвестыцыйных праектаў, выхад на адзіныя прынцыпы рэалізацыі аграрнай і прамысловай палітыкі, павышэнне ўзроўню ўзаемных сацыяльных гарантый для грамадзян дзвюх краін.**

**Паводле ацэнак беларускага боку, толькі прамы эфект ад рэалізацыі інтэграцыйнага пакета для Беларусі прагназуецца ў росце ВУП прыкладна на $1 млрд, не лічачы дадатковых магчымасцяў для беларускага бізнесу на расійскім рынку.**

Таксама Аляксандр Лукашэнка прапанаваў стварыць медыяхолдынг Саюзнай дзяржавы. Рэагуючы на выступленне дзяржсакратара Саюзнай Дзяржавы Дзмітрыя Мезенцава, які закрануў супрацоўніцтва ў галіне медыя, Прэзідэнт заявіў, што саюзныя СМІ неабходна рэфармаваць.

Напрыканцы пасяджэння Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што праз 25 гадоў з моманту падпісання Дагавора аб утварэнні супольнасці Беларусі і Расіі робіцца чарговы важны крок на шляху саюзнага будаўніцтва.

«Сёння намі зацверджаны маштабны пакет інтэграцыйных дакументаў. Яны накіраваны на ўмацаванне эканамічнага патэнцыялу дзвюх краін», — заўважыў ён і падзякаваў усім за карпатлівую і плённую працу, напрацоўшы ў рамках кампетэнцыі кожнага забяспечыць практычную рэалізацыю саюзных праграм і прынятых рашэнняў.

## «Не проста сусед, а брацкі народ»

У сваім выступленні Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Беларусь для Расіі — не проста добры сусед і найбліжэйшы саюзнік, а сапраўдная брацкая рэспубліка, брацкі народ. «І мы стараемся рабіць усё, каб так было заўсёды», — заявіў ён.

«Адмысловае значэнне набывае фарміраванне на нашых знешніх граніцах атмасферы стабільнасці і бяспекі. Мы маем намер разам супрацьстаяць любым спробам умяшання ва ўнутраныя справы нашых суверэнных дзяржаў. І Расія, вядома, будзе працягваць аказваць дапамогу брацкаму беларускаму народу. Ніякіх сумненняў тут няма», — заявіў расійскі лідар.

Ён выказаў упэўненасць, што Саюзная дзяржава і ў далейшым будзе якасна ўмацоўваць інтэграцыйнае ўзаемадзеянне, што ў канчатковым выніку дасць магчымасць павысіць узровень жыцця, дабрабыту грамадзян.

Па словах Уладзіміра Пуціна, Расія і Беларусь падаюць добры прыклад сваім партнёрам на постсавецкай прасторы. Прэзідэнт Расіі звярнуў увагу, што адным з інструментаў выхаду з крызісу лічыцца аб'яднанне намаганняў размешчаных побач адна ад адной краін, якія ідуць па шляху каапераціі.

## Ад ваеннай дактрыны да мытнага заканадаўства

На пасяджэнні Вышэйшага Дзяржаўнага Савета быў зацверджаны пакет інтэграцыйных дакументаў.

Вышэйшым Дзяржаўным Саветам Саюзнай дзяржавы была зацверджана новая Ваенная дактрына Саюзнай дзяржавы. Таксама ў Саюзнай дзяржаве аднавілі канцэпцыю міграцыйнай палітыкі. У дакументе вызначаны кірункі дзейнасці міністэрстваў унутраных спраў, органаў дзяржаўнай бяспекі і знешнепалітычных ведамстваў у сферы міграцыі. Па словах дзяржсакратара Саюзнай дзяржавы Дзмітрыя Мезенцава, актуальнасць дакумента пацвярджаюць падзеі на граніцы Беларусі і Еўрасаюза.

Падчас пасяджэння Вышэйшага Савета Саюзнай дзяржавы з дакладам выступіў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка. Паводле яго слоў, найважнейшым напрамкам узаемадзеяння Беларусі і Расіі стане гарманізацыя падатковага і мытнага заканадаўства. Краінам трэба будзе ўкараніць інтэграваную сістэму адміністравання ўскосных падаткаў і заключыць міжнародны дагавор аб агульных прынцыпах падаткаабкладання ў частцы ўскосных падаткаў. Акрамя таго, плануецца стварыць сумесныя кансультатыўныя органы Саюзнай дзяржавы па падатковых і мытных пытаннях.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Макрон узнагародзіў Меркель ордэнам Ганаровага легіёна

**Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон прысвоіў часова выконваючай абавязкі канцлера Германіі Ангеле Меркель званне кавалера ордэна Ганаровага легіёна. Уручэнне вышэйшай узнагароды Францыі адбылося ў французскім рэгіёне Бургундыя.**

«Я хацеў бы падзякаваць табе за тое, што ты так шмат чаму мяне навучыла. Дзякуй, дарагая Ангела, за ўсё, што ты зрабіла для Еўропы», — заявіў Макрон у прамове з нагоды ўзнагароджання Ангелы Меркель Вялікім крыжом ордэна Ганаровага легіёна. Французскі прэзідэнт падкрэсліў, што Ангела Меркель, знаходзячыся на пасадзе канцлера, садзейнічала захаванню адзінства Еўропы, «нягледзячы на ўсе ўзрушэнні».

## Сярод прышчэпленых жыхароў Хабараўскага краю разыграюць тры тоны вугалю

**Сярод тых жыхароў Хабараўскага краю, хто быў прышчэплены ад каранавіруса ў лістападзе, разыграюць латарэю, па выніках якой шэсць шчаслівчыкаў змогуць атрымаць абанемент у спартзалу, сертыфікат на медпаслугі або ў цырульню, тры тоны вугалю і мікрахвалеўку, паведаміў галоўны ўрач бальніцы раёна імя Лазо Ілья Аронія.**

«Стартуе розыгрыш сертыфікатаў для грамадзян, якія прайшлі вакцынацыю ад каранавіруса ў перыяд з 1 да 30 лістапада. Удзельнікамі могуць стаць паўналетнія жыхары Хабараўскага краю, якія прайшлі вакцынацыю менавіта ў нашым раёне. Падарункі. Першае — адна медкамісія, альбо паслуга з правам выбару, напрыклад, вадзіцельская медкамісія, на правы атрымання зброі, працаўладкаванне. Другое — стаматалагічная паслуга, якая не ўваходзіць у пералік бясплатных. Трэцяе — паслуга цырульні. Чацвёртае — абанемент у трэнажорную залу. Пятае — тры тоны вугалю, і шосты прыз — гэта мікрахвалевая печ», — сказаў урач Аронія.

Боль у сэрцы

# АПОШНІ ПАЛЁТ ЗЕМЛЯКОЎ...

**Колькасць загінулых пры крушэнні самалёта пад Іркуцкам павялічылася з сямі да дзевяці — па апошніх звестках, гэта ўсе, хто быў на борце. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў дзень трагедыі накіраваў спачуванне родным і блізкім экіпажа Ан-12 авіякампаніі «Гродна». «З глыбокім болем успрыняў сумную навіну аб крушэнні транспартнага самалёта беларускай авіякампаніі «Гродна» пад Іркуцкам, у выніку якога загінуў экіпаж паветранага судна, які складаўся з грамадзян Беларусі, Расіі і Украіны», — гаворыцца ў спачуванні.**

Ад імя беларускага народа і ад сябе асабіста Аляксандр Лукашэнка выказаў сем'ям загінулых членаў экіпажа шчырыя словы спачування і падтрымкі ў сувязі з цяжкай, незаменнай стратай. Кіраўнік дзяржавы пажадаў родным і блізкім загінулых мужнасці і стойкасці ў гэты цяжкі час.

У Гродзенскай вобласці акажуць неабходную падтрымку сем'ям загінулых землякоў. Аб гэтым 4 лістапада паведаміў старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік.

«Гэта трагедыя не толькі для блізкіх, але і для ўсіх нас. Ужо ўчора з сем'ямі двух членаў экіпажа, якія былі жыхарамі Гродзенскай вобласці, звязаліся псіхолагі, каб аказаць падтрымку. Звесткі аб сям'і яшчэ аднаго члена экіпажа з Гомельскай вобласці перадалі сваім калегам з гэтага рэгіёна. Мы гатовы аказаць усю неабходную падтрымку сем'ям загінулых», — сказаў Уладзімір Каранік. Ён падкрэсліў, што ў рэгіёне акажуць дапамогу і следству для высвятлення прычын трагедыі, а таксама для таго, каб такое больш ніколі не паўтарылася.

Ранкам 4 лістапада, па інфармацыі Усходне-Сібірскай транспартнай пракуратуры, стала вядома, што знойдзены другі самапісец самалёта Ан-12, які разбіўся пад Іркуцкам (пра першы паведамлялася напярэдадні). «Знойдзена два самапісцы — маўленчы і параметрычны. Маўленчы канфіскаваны. Параметрычны знаходзіцца ў хваставой частцы самалёта, падлягае канфіскацыі».

Спецыялісты па правядзенні генетычнай экспертызы, якія займуцца дасledаваннем астанкаў загінулых пры крушэнні грузавога самалёта Ан-12, могуць пачаць работу на працягу найбліжэйшых трох дзён. Пра гэта паведаміў учора кіраўнік Іркуцкай вобласці Ігар Кобзеў.

«Сёння мы вызначыліся, што на працягу двух дзён будуць праведзены ўсе следчыя дзеянні, каб далей ужо займацца пытаннямі, звязанымі з дастаўкай цел загінулых. Акрамя таго, мы прыцягваем спецыялістаў па правядзенні генетычнай экспертызы, і сёння нам пацвярджаюць, што гэта магчыма на працягу трох дзён», — сказаў Ігар Кабзеў.

Ён таксама растлумачыў, што працу следчых на месцы ўскладнялі снегапад і завіруха, таму ў ходзе пасяджэння камісіі па папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і забеспячэнні пажарнай бяспекі Іркуцкай вобласці намеснік кіраўніка Усходняга міжрэгіянальнага СУ СК РФ на транспарце Аляксандр Каротkіх папрасіў улады аказаць дапамогу ў расчыстцы снегу, адзначыўшы, што першасны агляд месца здарэння неабходна завяршыць да вечара чацвярга. «Там знаходзяцца не менш як 50 чалавек. Вызначымся цяпер з інструментам, я думаю, яны гэта зробяць. Нічога складанага ў гэтым няма», — адзначыў Ігар Кобзеў. Да ліквідацыі наступстваў прыцягнуты 296 чалавек і 76 адзінак тэхнікі.

Надаем, што 3 лістапада ў 11.34 пры сыходзе на другі круг у аэрапорце Іркуцка ў складаных метэаралагічных умовах (снег з дажджом, ледзяны дождж) самалёт «Авіякампаніі Гродна» АН-12БК EW-518TI пацярпеў катастрофу ў раёне населенага пункта Півавbooўрыха за сем кіламетраў ад Іркуцка. Сярод версій крушэння паветранага борту следства разглядае памылку пілатавання, умовы надвор'я, а таксама тэхнічную няспраўнасць самалёта.

Паветраным суднам кіраваў вопытны экіпаж, у склад якога ўваходзіла сем чалавек: два грамадзяніны Расійскай Федэрацыі, два — Украіны і тры — Рэспублікі Беларусь. Камандзір меў агульны налёт больш чым 12 тысяч гадзін, у тым ліку на тыпе Ан-12 — больш чым 7 тысяч. Гэта ўжо інфармацыя ад нашага Міністэрства транспарту і камунікацый.

Калі першапачаткова была інфармацыя пра тое, што на борце паветранага судна груз адсутнічаў, дык потым з'явілася паведамленне: ляцеўшы з Якуцка ў Іркуцк, самалёт Ан-12 перавозіў прадукты, і два чалавекі з дзевяці загінулых былі прадстаўнікамі авіякампаніі «Запаляр'е», якія яго суправаджалі.

Між тым Дэпартаментам па авіяцыі прынята рашэнне аб прыпыненні камерцыйнай эксплуатацыі самалётаў Ан-12 да атрымання вынікаў расследавання. Беларускія самалёты Ан-12 не будуць эксплуатавацца да заканчэння расследавання прычын крушэння аналагічнага судна пад Іркуцкам. Аб гэтым паведаміў журналістам дырэктар Дэпартамента па авіяцыі Арцём Сікорскі. Ён дадаў, што прычыны крушэння пасля заканчэння расследавання агучыць спецыяльна створаная камісія.

Упаўнаважаныя прадстаўнікі Дэпартамента па авіяцыі Міністэрства транспарту і камунікацый 4 лістапада адправіліся ў Іркуцк для ўдзелу ў расследаванні авіяцыйнага здарэння з самалётам Ан-12. Беларускі бок праінфармавалі аб знойдзеных чорных скрынях з борта, нумары якіх супалі са звесткамі Дэпартамента па авіяцыі.

«У шэрагу СМІ адзначаюць, што самалёт, які разбіўся, нібыта не праходзіў супрацьаблядзяняльную апрацоўку пры вылеце з Якуцка. Хочам растлумачыць, што дадзеная апрацоўка праводзіцца толькі для забеспячэння вылету паветранага судна, а ў палёце экіпажам уключаецца супрацьаблядзяняльная сістэма», — сказалі ў Мінтрансе.

У міністэрстве таксама падкрэслілі, што цяпер пры актыўным узаемадзеянні з расійскімі калегамі арганізоўваецца дастаўка цел загінулых.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

# Некамфортныя выхадныя

## Вецер з Балтыкі прынясе нам істотныя дажджы і — месцамі — моцны парывісты вецер

**Позняя восень. Надвор'е не песціць. Вось і на фінішы гэтага тыдня ў нас чакаецца няўстойлівы характар надвор'я. Франтальныя раздзелы будуць прыносіць усё новыя і новыя порцыі ападкаў, тэмпературны фон пачне паступова паніжацца, не дадасць камфорту і моцны парывісты вецер, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу і нядзелю характар надвор'я будуць вызначаць франтальныя раздзелы і няўстойлівая паветраная маса, якая паступае з поўдня Балтыйскага мора. У суботу ўначы месцамі, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе 1—7 цяпла, а ўдзень — ад плюс 5 градусаў да 12 градусаў вышэй за нуль.

У нядзелю на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. У асобных раёнах магчымы слабы туман. Вецер прагназуецца паўднёва-заходні парывісты, месцамі моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы злёгку павялічыцца і складзе 2—7 цяпла, а ўдзень — пры зацягнутым небе, усё тыя ж 5—12 градусаў вышэй за нуль.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак краіна апынецца пад уплывам атмасферных франтоў ад цыклону, якія ссоўваюцца з поўдня Скандынавіі на паўночна-заходнія раёны еўрапейскай часткі Расіі. У далейшым за гэтымі франтамі ў Беларусь пачне паступаць халодная няўстойлівая паветраная маса.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Кантэкст

# МЗС: Беларусь ніколі не правакавала і не мае намеру правакаваць пагранічныя інцыдэнты

**Сур'ёзна насцярожваюць сістэмныя спробы Варшавы беспадстаўна і эпатажна павышаць градус напружанасці на беларуска-польскай граніцы. Аб гэтым гаворыцца ў заяве МЗС Рэспублікі Беларусь.**

«Чарговая заява для СМІ аб нейкім «заходзе» 2 лістапада з тэрыторыі Беларусі неўстаноўленых «узброеных асоб у форме» зноў з'яўляецца галаслоўнай. Як і ў папярэдніх выпадках, пры ўсёй тэхнічнай аснашчанасці польскага боку чамусьці менавіта найбольш адыёзныя выкрыкі не маюць ніякіх фактычных пацвярджэнняў, — адзначаецца ў заяве знешнепалітычнага ведамства. — Няма ні фота, ні відэа, ні часу, ні якіх-небудзь іншых даных аб'ектыўнага кантролю. Уласна, і не можа быць, таму што гэта няпраўда».

МЗС адзначае, што польскі бок не прадставіў ніводнага фактычнага пацвярджэння ў адказ на прадугледжаныя для такіх выпадкаў аператыўныя запыты беларускага боку.

«Замест двухбаковых механізмаў, якія паспяхова функцыянуюць шмат гадоў, для эфектыўнага высвятлення і вырашэння любых такіх інцыдэнтаў афіцыйная Варшава мэтанакіравана выкарыстоўвае выключна мегафонную дыпламатыю, дагматычныя заявы для СМІ і бессэнсоўную папуліцкія шараханні па прыкладзе накіравання нікім не чаканых гуманітарных канвояў, — адзначаецца ў заяве. — Такімі інструментамі не вырашалася і ніколі не вырашыцца ні адно міжнароднае пытанне».

Цалкам відавочна, што гэты набор дзеянняў уяўляе сабой звычайную правакацыю і сістэмную спробу дэманізаваць Беларусь. Мэта — адцягнуць увагу сусветнай супольнасці ад сваіх абуральных праціпраўных паводзін з мігрантамі і бежанцамі ад грубага парушэння абавязацельстваў у сферы правоў чалавека, а таксама апраўдаць у вачах польскай грамадскасці непапулярныя дзеянні па ўзвядзенні агароджы і мілітарызацыі граніцы.

«Мы разумеем, што польскаму боку неабходна павысіць градус напружанасці для атрымання дадатковага фінансавання пры будаўніцтве «Варшаўскай жалезнай заслоны». Невыпадкова гэта інсцэніроўка супала па часе з уступленнем у сілу закона аб будаўніцтве сцяны на беларуска-польскай граніцы, — заўважылі ў МЗС. — Аднак мы не прымаем выкарыстанне Беларусі ў якасці шырмы для падману польскім кіраўніцтвам свайго народа і падаткаплацельшчыкаў».

У МЗС адзначылі, што яшчэ больш насцярожвальным з'яўляецца той факт, што правакацыі ў адносінах да Беларусі маюць мэту стварыць ваяўнічы клімат у польскім грамадстве, у ЕС і НАТА ў цэлым для апраўдання курсу польскіх уладаў, накіраванага на мілітарызацыю краіны дзеля скарачэчных унутрыпалітычных амбіцый.

«Фальшывыя ўкіды і штучнае стварэнне бачнасці ўяўнай ваеннай пагрозы відавочна нацэлены на паглыбленне ў сітуацыю буйных геапалітычных ігракоў, у тым ліку напярэдадні сустрэчы міністраў замежных спраў краін НАТА ў Рызе. Гэта вельмі рызыкоўная гульня нагадвае высяканне іскры пасярод парахавога склада. Гэта безадказна. На коне бяспека ўсяго рэгіёна. У сувязі з гэтым яшчэ раз заяўляем, што Беларусь ніякім чынам не ставіць пад сумненне правa і здольнасць Польшчы, як і любой іншай дзяржавы, абараняць свае граніцы. Беларускаму боку зусім невыгадная любая эскалацыя ў рэгіёне, — адзначаецца ў заяве. — Беларусь ніколі не правакавала і не мае намеру правакаваць пагранічныя інцыдэнты. Яшчэ раз заклікаем польскі бок змірыцца з бессэнсоўнасцю націску на суверэнную суседнюю дзяржаву і ў выпадку наяўнасці любых пытанняў, якія патрабуюць сумеснага разгляду, у поўнай меры задзейнічаць дыпламатычныя каналы і іншыя ўстаноўленыя формы міждзяржаўнай і міжведамаснай камунікацыі, а не ствараць толькі такую бачнасць».

Сітуацыя з мігрантамі на граніцы становіцца ганебнай для Польшчы і дэманструе прыкметы злачынства супраць чалавечнасці. Пра гэта гаворыцца ў заяве членаў Канферэнцыі паслоў Рэспублікі Польшча, паведамляе польскі партал навінаў Onet.

Па словах удзельнікаў канферэнцыі, кіруючая польская партыя «Права і справядлівасць» (PiS) для вырашэння міграцыйнага крызісу магла звярнуцца ў пагранічную службу ЕС Frontex з просьбай вылучыць персанал, а таксама запытаць фінансаву падтрымку са спецыяльнага фонду, які кіруе Еўрапейскай камісіяй. Але польскія ўлады вырашылі дзейнічаць інакш. «PiS аддае перавагу ігнараваць закон і даступныя працэдуры дапамогі. Замест гэтага яна ўзмацняе надзвычайнае становішча на граніцы з Беларуссю і плануе пабудаваць сцяну за 1,5 млрд злотых», — гаворыцца ў заяве. Між тым, адзначаецца ў дакуменце, трагедыя на граніцы пагаршаецца. «Практыка рэпрэсій, забароненая міжнародным правам, стала дзеючым нацыянальным заканадаўствам у Польшчы і прымяняецца без ваганняў», — гаворыцца ў заяве.

Адзначаецца, што ўвядзенне надзвычайнага становішча жорстка абмежавала правы журналістаў, якім было адмоўлена ў асвятленні падзей на граніцы. Акрамя таго, гуманітарныя арганізацыі, якія жадаюць дапамагчы бежанцам, якія заселі на граніцы, не могуць атрымаць да іх доступ.

«У польскіх лясах гінуць людзі — ад знясілення, смагі і голаду. PiS выкарыстоўвае свой любімы палітычны інструмент: узбуджэнне страху і нянавісці да незнаёмцаў. Яна заяўляе аб павазе да гісторыі Польшчы, але не жадае згадваць, як часта палякі ў XIX і XX стагоддзях шукалі прытулак за мяжой. Наадварот, PiS падбухторвае палякаў быць абыякавымі да няшчасных людзей, зняволеных у турму на граніцы», — заяўляюць члены Канферэнцыі паслоў.

**Пётр ДУНЬКО.**

**• Тым часам**

У Міністэрства замежных спраў Беларусі быў выкліканы часовы павераны ў справах Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Вайцяхоўскі. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе МЗС. Польскаму дыпламату быў заяўлены рашучы пратэст у сувязі з распаўсюджанай афіцыйнымі асобамі Польшчы заявай аб нейкім «заходзе» 2 лістапада ў Польшчу з тэрыторыі Беларусі неўстаноўленых «узброеных асоб у форме». Увага польскага боку звернута на той факт, што тыражаванне падобных абсалютна бяздоказных інсінуацый стала ўжо нормай у паводзінах афіцыйнай Варшавы. Марціну Вайцяхоўскаму жорстка ўказана на недапушчальнасць нагнятання абстаноўкі на граніцы.

Блізкая ўлада

## ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 6 лістапада, з 9.00 да 12.00 праводзяць:**

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Мікалаевіч БЕЛАВУС. Тэл. 8 021 222 22 22;
- старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь Міхайлавіч САЛАВЕЙ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васільевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Лічбавыя тэхналогіі

# Закон аб персанальных даных уступіць у сілу 15 лістапада

Аб гэтым было заяўлена падчас работы ў Гродне рэгіянальнага форуму #GBCregions (Дзяржава. Бізнес. Грамадзяне — рэгіёны)

**Старт рэгіянальных форумаў быў дадзены сёлета ў Мінску. Кожны рэгіён мае сваю тэматыку. На гродзенскім у цэнтры ўвагі паўсталі лічбавыя рашэнні ў сферах адукацыі, аховы здароўя, аховы персанальных даных. Акцэнт быў зроблены на забеспячэнні краіны сучаснымі лічбавымі тэхналогіямі.**

У рабоце форуму прынялі ўдзел кіраўнікі дзяржаўных органаў і арганізацый, абласнога і раённых выканаўчых камітэтаў, прадстаўнікі IT-кампаній, банкаў, бізнесу і навучальных устаноў.

Як адзначыў падчас адкрыцця форуму **намеснік начальніка Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Сяргей ЖАРНАСЕК**, краіна ў плане інфарматызацыі мае пэўныя напрацоўкі. Так, з 1 верасня ўведзены ў дзеянне біяметрычныя дакументы на выезд і ўезд у Беларусь. Для іх выдачы створана адпаведная інфраструктура. Атрымала далейшае развіццё сістэма міжведамасных інфармацыйных адносін, што з'яўляецца базай электроннага ўрада. Гэта структура ў далейшым прызначана забяспечыць бяспеку адносін паміж грамадзянамі, бізнесам і дзяржавай. Акрамя гэтага, уведзены ў эксплуатацыю шэраг ведамасных інфармацыйных рэсурсаў, што таксама з'яўляецца часткай электроннага ўрада. Вядзецца работа па ўкараненні канцэпцыі разумнага горада на рэгіянальным узроўні.

Што датычыцца аховы здароўя, цяпер распрацоўваецца цэнтральная платформа, на базе якой будуць абслугоўваць насельніцтва ўсе бальніцы і паліклінікі краіны. Гэта і электронныя рэцэпты, якія ўжо працуюць, і электронныя карты. Чалавек зможа зайсці са сваімі персанальнымі данымі ў свой рабочы кабінет на гэтай платформе і атрымаць як кансультацыю ўрача, так і сацыяльнага работніка, і іншых спецыялістаў, паведаміў **намеснік міністра аховы здароўя Барыс АНДРАСЮК**.

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК** падкрэсліў, што ўкараненне лічбавых тэхналогій у ахову здароўя дазваляе больш аператыўна прымаць рашэнні і знізіць рызыку чалавечай памылкі. Пакуль у медыцынскай сферы інфармацыйныя тэхналогіі недастаткова выкарыстоўваюцца ў практычнай дзейнасці, хоць менавіта тут можна атрымаць найбольшую аддачу. Але гэтыя сістэмы павінны быць адкрытымі, мець магчымасць абмену інфармацыяй. Пры гэтым уся база павінна быць дакладна абароненая. І над гэтым трэба яшчэ працаваць.

Цікавую інфармацыю паведаміў на форуме **генеральны дырэктар ААТ «Упраўляючая кампанія холдынга «Белкамунмаш» Алег БЫЦКО**. Ён расказаў аб распрацоўках грузавога электрамабіля з беспілотным упраўленнем. Гэта мадэль будзе прадэманстравана ў канцы года. Цяпер прадпрыемства актыўна развівае электратранспарт. У прыватнасці, ёсць праект па міжгародніх электробусах. Паралельна вядзецца работа над пілотным праектам па стварэнні комплекснай зараднай



Фота БелТА.

станцыі, якой зможа карыстацца як дзяржаўны, так і прыватны транспарт любых мадэляў.

Прадстаўнікі прыватнага IT-бізнесу чакаюць ад укаранення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій умацавання дзяржаўнага і прыватнага партнёрства. Варта сказаць, што беларускія тэхналогіі і канцэпцыі з'яўляюцца даволі сучаснымі. Зараз важна спрацаваць адносіны паміж дзяржавай і грамадзянамі з дапамогай лічбавых тэхналогій у рамках праектаў «Разумныя гарады» і «Электронны ўрад». Усе ініцыятывы павінны быць зразумелымі абывацелю.

Пераход у лічбавую эпоху нясе шмат камфортных і зручных змен. Але не варта забываць і аб небяспецы, заўважыў падчас форуму **міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ**. Моладзь цяпер не ўяўляе сябе без гаджэтаў. Між тым новыя тэхналогіі нясуць новыя рызыкі і выклікі. Прычым бяспека ўзнікае як для грамадства і дзяржавы, так і для кожнага чалавека. Часам звесткі, якія не прызначаныя для распаўсюджвання, становяцца даступнымі тым, хто можа імі скарыстацца ў негатыўных мэтах. А гэта і маніпуляцыі, і пагрозы, і ўплыў на свядомасць чалавека. У такіх умовах важна абараніць асобу, грамадства і дзяржаву не толькі ад унутраных, але і знешніх пагроз, лічыць міністр.

Такім інструментам павінен стаць Закон «Аб ахове персанальных даных», які ўступае ў сілу 15 лістапада. Аб гэтым паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення — начальнік аддзела канстытуцыйнага права Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Мікалай САВАНОВІЧ**. Беларусь застаецца адзінай краінай на постсавецкай прасторы, дзе пакуль не было такога закона. Яго распрацоўка вялася пры актыўным удзеле Міністэрства ўнутраных спраў. Закон дазволіць не толькі ўстанавіць прававыя рамкі работы з персанальнымі данымі, але і павысіць адукацыйны ўзровень тых, хто з імі працуе, дадаў спікер. Ён звярнуў увагу на той факт, што не бывае бясплатных сэрвісаў. Ёсць абмен сэрвісу на персанальныя даныя. Паўплываць на чалавека можна, калі ведаеш яго імя і прозвішча.

У сувязі з прыняццем Закона «Аб ахове персанальных даных» створаны адпаведны цэнтр, які будзе ажыццяўляць кантроль за апрацоўкай персанальных даных, разглядаць скаргі, прыпыняць дзейнасць тых аператараў, якія не выконваюць свае абавязкі. Таксама цэнтр будзе супрацоўнічаць з іншымі краінамі ў гэтым кірунку.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Меркаванне дэпутата

**Вольга ПЕТРАШОВА:**

# «На выклікі можна адказаць толькі яшчэ больш цесным аб'яднаннем»

**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах — пра ўзаемаадносіны з краінамі-суседкамі, несправядлівасць санкцый і курс на будучае.**




Работа ў парламенцкай Камісіі па міжнародных справах патрабуе трымаць руку на пульсе. Суразмоўніца не па чутках ведае стан спраў на граніцы Беларусі з краінамі Еўрасаюза, наколькі глыбока мы прасунуліся ў перагаворах з Расіяй, якія мэты праследуюць санкцыі Еўрасаюза. Пра ўсё гэта — у адказах на пытанні карэспандэнта «Звязды».

***— Сёння тэма мігрантаў крыху адышла на задні план, але не перастала існаваць. Напружанне на граніцы з найбліжэйшымі суседзямі — Польшчай і Літвой — па-ранейшаму існуе. З'яўляецца інфармацыя пра ўвядзенне новых санкцый з боку ЕС у адносінах да Беларусі з-за сітуацыі з мігрантамі.***

— Мы шкадуем, што замест зместоўнага сумеснага абмеркавання важных пытанняў нашы еўрапейскія партнёры і асабліва Літва і Польшча пры падтрымцы Еўрасаюза працягваюць выстаўляць неабгрунтаваныя абвінавачанні ў адрас нашай краіны. Але Беларусь не з'яўляецца прычынай гэтага крызісу. Еўрапейцы дэ-факта спрабуюць пераклаць на нас адказнасць, пры гэтым ігнаруюць прынцыпы добрасуседства, узаемавыгаднага супрацоўніцтва ў ахове граніц, звяртаюцца да самых радыкальных і бесчалавечных метадаў вырашэння міграцыйнай праблемы. Яны прымаюць законы, якія супярэчаць дэмакратычным прынцыпам, выкарыстоўваюць негуманную практыку. Нашы суседзі крытыкуюцца ААН, Саветам Еўропы і іншымі міжнароднымі аўтарытэтнымі арганізацыямі па правах чалавека, але працягваюць іх ігнараваць, і Еўрасаюз ім патурае. Што гэта, калі не двайныя стандарты? Набліжаюцца халады і ўзрастаюць рызыкі для здароўя і жыцця мігрантаў. І калі да заклікаў міжнародных арганізацый нашы партнёры глухія, то гуманітарныя меркаванні павінны падштурхнуць іх да вырашэння крызіснай сітуацыі.

***— Чым пагражае нагнятанне абстаноўкі з міграцыйнымі патокамі? Якія захады робіцца з боку нашай краіны, каб выправіць сітуацыю?***

— За апошнія месяцы наша краіна неаднаразова інфармавала замежных калег, што ў сувязі з санкцыйным ціскам і замарозкай тэхнічнага супрацоўніцтва ў беларускага боку не становіцца больш рэсурсаў і магчымасцей па папярэджанні патокаў нелегальнай міграцыі. Аднак, не маючы магчымасці самастойна кантраляваць дадзеную сітуацыю, ігнаруючы прынцыпы двухбаковага ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў сферы аховы граніцы, літоўскія і польскія ўлады прымянялі радыкальныя спосабы для вырашэння праблемы. У парушэнне дамоўленасці літоўскімі спецслужбамі ажыццяўляецца незаконная дастаўка да граніцы і прымусовае выцісканне на беларускую тэрыторыю бежанцаў, у асобных выпадках з прымяненнем гвалту і пагроз. Такія дзеянні з'яўляюцца прамым парушэннем палажэнняў двухбаковых дагавораў аб рэжыме аховы дзяржаўнай граніцы, у адпаведнасці з якімі затрыманая адным з бакоў асоба не перадаецца другому, калі яна звярнулася з просьбай аб прытулку. Падобныя дзеянні выходзяць за рамкі міжнароднага права і агульначалавечых прынцыпаў маралі. Супрацьпраўныя дзеянні літоўскіх і польскіх сілавікоў прыводзяць да таго, што мігранты асцерагаюцца звяртацца да афіцыйных прадстаўнікоў гэтых краін. І такой сітуацыяй могуць скарыстацца саўдзельнікі падпольнай міграцыі на тэрыторыі Еўрасаюза. Эксперты ў сферы аховы граніц пацвердзяць, што такімі мерамі, як будаўніцтва агароджы з калючага дроту, тым больш тэзісамі пра гібрыдную вайну, праблему не вырашыць. Любы прафесіянал пацвердзіць, што канал нелегальнай міграцыі нельга арганізаваць за адзін дзень, яго прафілактыка і папярэджанне патрабуюць узаемадзеяння ўсіх праваахоўных органаў не толькі ўнутры транзітнай дзяржавы, але і краін, адкуль мігрыруе чалавек і куды. Сітуацыя патрабуе комплекснага падыходу, які можа быць забяспечаны толькі вяртаннем да канструктыўнага дыялогу. Мы перакананыя ў тым, што беларускія пагранічнікі і іх еўрапейскія калегі здольныя ў сціслыя тэрміны выпрацаваць прафесійнае рашэнне па нейтралізацыі пагроз, якія ўзніклі. Аднак на палітычным узроўні асобныя еўрапейскія краіны па-ранейшаму абмяжоўваюцца абвінавачаннямі, паставіўшы такім чынам сітуацыю ў тупік. Адказ на трансгранічную пагрозу можа быць знойдзены толькі сумеснымі намаганнямі, паколькі граніцу ніводная краіна не ў сілах ахоўваць у адзіночку.

***— На гэтым тыдні адбудзецца сумеснае пасяджэнне Пастаяннага камітэта Беларусі і Расіі. Вы з'яўляецеся дэпутатам камісіі па інфармацыйнай палітыцы Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі. Што вы як саюзны парламентарый чакаеце ад гэтай сустрэчы?***

— Сёння робіцца беспрэцэдэнтны ціск на нашу эканоміку і палітыку. Мэта Еўрасаюза — знішчыць нашы рабочыя калектывы і вядомыя ў свеце беларускія прадпрыемствы. Ідзе спроба падарваць нашу эканоміку, узровень дабрабыту беларускага народа, справакаваць сацыяльную незадаволенасць насельніцтва. Нядобразычліўцам не падабаецца, што наша суверэнная дзяржава сёння праводзіць самастойную знешнюю і ўнутраную палітыку. Свае дзеянні Еўрасаюз спрабуе паднесці як знак падтрымкі беларускага народа. Пры гэтым ён не чуе заклік мільёнаў беларускіх людзей адклікаць санкцыі. Вельмі цынічна на дадзеным фоне Еўрасаюз дэкларуе панцэе «ўсё для людзей». Апошнім часам ідуць пагрозы нават Расійскай Федэрацыі за тое, што яна падтрымлівае нас. Саюзная дзяржава — самае паспяховае інтэграцыйнае ўтварэнне на постсавецкай прасторы. І калі на нашы краіны ідзе ціск звонку, адказаць на гэтыя выклікі можна толькі яшчэ больш цесным аб'яднаннем і ўмацаваннем супрацоўніцтва.

Чакаецца, што 4 лістапада прэзідэнты Беларусі і Расіі падпішуць 28 саюзных праграм і гэтым вызначаць будучае нашых краін. Гэта ўжо будзе іншы ўзровень згуртаванасці ва ўсіх сферах узаемадзеяння. Дэстабілізаваць абстаноўку ў нашых краінах не атрымаецца, а восьтакія агрэсіўныя неабгрунтаваныя дзеянні, якія мы назіраем з боку ЕС, выпрацоўваюць імунітэт і робяць нас яшчэ больш моцнымі.

**Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Грошы

# Маёмасныя падаткі трэба заплаціць да 15 лістапада

**Пра гэта нагадала на прэс-канферэнцыі намеснік начальніка ўпраўлення падаткаабкладання даходаў і маёмасці фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Кацярына ЗАРЭЦКАЯ.**

Прадстаўнік міністэрства таксама расказала, хто павінен выплачваць падатак на нерухомасць. Гэта грамадзяне нашай краіны альбо падданыя замежнай дзяржавы і асобы без грамадзянства, якія на тэрыторыі Беларусі маюць аб'екты нерухомасці: на праве ўласнасці, прынятыя па спадчыне, таксама не завершаныя будаўніцтвам або ўзятыя ў фінансавую арэнду.

### Больш за 215 тысяч чалавек валодае больш чым адной кватэрай

У асноўным стаўка падатку на нерухомасць аказваецца ў памеры 0,1 % ад кошту аб'екта, але... У дачыненні да жылых памяшканняў у шматкватэрных ці блакіраваных жылых дамах для фізічных асоб, якія маюць два і больш жылых памяшканняў, прымяняецца стаўка ў памеры 0,2 % ад кошту. Дарэчы, стаўкі падатку на нерухомасць могуць павялічвацца або памяншацца рашэннямі мясцовых Саветаў дэпутатаў (але не больш чым у два разы). Напрыклад, у Мінску стаўка падатку за другую кватэру (сярэднюю, двухпакаёвую) складае 240—260 рублёў на год.

«Па справаздачных даных, у цяперашні час у Беларусі дзвюма і больш кватэрамі валодае звыш 215 тысяч фізічных асоб», — адзначыла намеснік начальніка ўпраўлення Міністэрства.

### Хто ад падатку вызвалены?

Наогул, у нашай краіне існуе дастаткова колькасць катэгорый грамадзян, якія вызваляюцца ад выплаты падатку на нерухомасць. Кацярына Зарэцкая адзначыла, што на дадзены момант ад выплаты падатку на нерухомасць вызваляюцца тыя фізічныя асобы, якім належыць толькі адна кватэра. Людзі, якія валодаюць дзвюма і больш кватэрамі, не абкладаюцца падаткам на нерухомасць у дачыненні да аднаго аб'екта нерухомасці. Другі і наступны абкладаюцца падаткам. Пры гэтым права выбару кватэры, якая будзе вызваляцца ад аплаты падатку на нерухомасць, ускладваецца на самога плацельшчыка. Такі выбар ён можа ажыццявіць, падаўшы апавяшчэнне ў падатковы орган.

Таксама не плацяць маёмасны падатак і пенсіянеры па ўзросце. Яны вызваляюцца ад аплаты падатку на нерухомасць у дачыненні да жылых дамоў, гаражоў, садовых домікаў, дач і машына-месцаў, аднак... Пры аплаце падатку на нерухомасць вызваляюцца толькі тыя жылыя дамы, у якіх не зарэгістраваныя працаздольныя асобы. Таксама спецыяліст звярнула ўвагу на тое, што пенсіянеры, як і астатнія фізічныя асобы, вызваляюцца ад падатку толькі ў дачыненні да адной кватэры, якая ім належыць.

Падатковую льготу маюць і члены шматдзетнай сям'і. Такія асобы вызваляюцца ад аплаты падатку за любыя аб'екты, якія ім належаць, — на жылыя дамы, кватэры, садовыя домікі, дачы, гаражы і машына-месцы.

Не плацяць падатак на нерухомасць і фізічныя асобы, якія пражываюць у сельскай мясцовасці. Дадзеныя грамадзяне павінны працаваць у пэўных арганізацыях, размешчаных у сельскай мясцовасці. Такім людзям ільготы па падатку на нерухомасць прадастаўляюцца ў дачыненні да аб'ектаў, размешчаных там жа — у вёсцы.

І яшчэ. Шэрагу фізічных асоб ільготы па падатку на нерухомасць могуць давацца па рашэнні мясцовых выканаўчых камітэтаў у сувязі са знаходжаннем гэтых людзей у цяжкіх жыццёвых абставінах. Каб атрымаць такую льготу, чалавек павінен звярнуцца ў мясцовы выканкам.

Ільготы па зямельным падатку падобныя з пералікам ільгот па падатку на нерухомасць. Гэта таксама вызваленне ад аплаты зямельнага падатку пенсіянераў па ўзросце, членаў шматдзетных сем'яў, асоб, якія з'яўляюцца інвалідамі 1-й, 2-й груп, недзеяздольных асоб і іншых. Ільгота прадастаўляецца толькі ў дачыненні да зямельных участкаў, якія выкарыстоўваюцца імі ў асабістых мэтах.

### Маёмасны падатак дадае 7 % штогод

А і напраўду цікава, колькі ж збіраецца з дапамогай двух падаткаў? Летась да аплаты было прад'яўлена каля 60 млн рублёў падатку на нерухомасць і 27 млн рублёў — зямельнага падатку. Як аказалася, штогод агульная сума аплачаных падаткаў расце прыкладна на 7 %. Працэнт добраахвотнай выплаты падаткаў даволі высокі — больш за 99 %. За 9 месяцаў 2021 года прад'яўлена да аплаты 65 млн рублёў падатку на нерухомасць і 28 млн рублёў — зямельнага падатку. Істотнае павелічэнне сумы падатку на нерухомасць — гэта вынік павышэння ставак падатку, ці мы сапраўды сталі набываць больш дарагую нерухомасць? Існіна дзесьці пасярэдзіне.

### Падатковая база можа павялічыцца на 1,5 млн уласнікаў

Калі мы гаворым пра тых гарадскіх жыхароў, якім належыць толькі адна кватэра, то ў дачыненні да іх падатковую льготу могуць з часам прыбраць.

Варта нагадаць, што праект Падатковага кодэкса на 2022 год змяшчае прапанову аб адмене падатковай ільготы для ўласнікаў жылых памяшканняў у шматкватэрных дамах з мэтай «выраўноўвання ўмоў для ўладальнікаў кватэр і індывідуальных жылых дамоў».

Адмена ў Беларусі падатковай ільготы на першыя кватэры прывядзе да істотнага росту плацельшчыкаў падатку на нерухомасць. Калі папраўкі аб увядзенні ўсеагульнага падатку на нерухомасць будуць прынятыя, то плацяць яго стане на 1,5 млн беларусаў больш. Менавіта такая колькасць чалавек валодае толькі адной кватэрай і да нядаўняга часу не плаціла за яе падатак, хоць ніякіх дадатковых ільгот не мела.

«Але хацелася б падкрэсліць, што законапраект яшчэ не прыняты, таму казаць аб прыняцці канчатковага рашэння пакуль рана», — падкрэсліла Кацярына Зарэцкая.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# БІЗНЕС НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Сёння ў Магілёве падвядуць вынікі XII інвестфоруму «Млын поспеху»

**У Магілёў прыехалі дыпламаты і бізнесмены з Расіі, Таджыкістана, Пакістана, Бразіліі. З учарашняга дня яны знаёмяцца з патэнцыялам вядучых магілёўскіх прадпрыемстваў «Магілёўхімвалакно», «Магатэкс», «Магілёўліфтмаш», «Магілёўтрансмаш», вывучаюць магчымасці СЭЗ «Магілёў», сустракаюцца з прадстаўнікамі бізнесу, прапрацоўваюць шляхі патэнцыяльнага супрацоўніцтва. Некаторыя з удзельнікаў ужо рэалізавалі тут свае праекты і жадаюць запусціць новыя. Магілёўшчына — вельмі прыдатны рэгіён для рэалізацыі ідэй, у тым ліку інавацыйных і нават зусім яшчэ не абкатаных.**

Менавіта з такіх сустрэч, на думку намесніка **старшыні Магілёўскага аблвыканкама Руслана СТРАХАРА**, і нараджаецца цікавасць да супрацоўніцтва.

— Гэты інвестфорум ужо дванаццаты, — заўважае ён. — Летась пандэмія не дазволіла нам яго правесці, і мы адразу адчулі, што гэтых стасункаў не хапіла. Як паказвае практыка, форум, усе буйныя інвестпраекты, якія рэалізаваліся, калісьці пачыналіся менавіта ў выглядзе ідэй або пагадненняў на форуме. Буйныя інвестары, прыйшоўшы сюды і пазнаёміўшыся, убачыўшы адносіны ўлады, створаную тут інфраструктуру падтрымкі, прынялі рашэнні і рэалізавалі ў нас свой патэнцыял. Дарэчы, на папярэднім форуме, які адбыўся пазалетась, было падпісана 14 пагадненняў на суму каля 200 мільёнаў долараў, якія прадугледжвалі стварэнне 650 працоўных месцаў. Прайшло два гады, і шмат якія праекты ўжо рэалізаваліся ў канкрэтныя інвестыцыйныя праграмы.

Сёлетні інвестфорум праходзіць з ухілам на паўднёва-ўсходні рэгіён. Першапачаткова яго нават і планавалася правесці ў Слаўгарадзе, дзе баброўскае прадпрыемства «Чырвоны харчавік» рэалізуе свой паспяховы праект. Гэты райцэнтр наогул апошнім часам вылучыўся сярод астатніх развіццём турыстычнага кірунку. Гэта не можа не радаваць. Бо раён моцна пацярпеў ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, і тое, што ён становіцца зноў прывабным і для турызму, і для бізнесу, шмат пра што гаворыць. І такія прыклады ёсць не толькі ў Слаўгарадскім раёне.

Задача арганізатараў форуму — паказваць найлепшы вопыт і прапаноўваць новае, адзначае Руслан Страхар. Цяпер рэгіён знаходзіцца на пачатковым этапе новай пяцігодкі, гэта фактычна запуск новага інвестцыкла, таму важна прааналізаваць, што было зроблена апошнім часам і прапанаваць патэнцыяльным інвестарам магчымасці.

«Наш паўднёвы ўсход — добрая пляцоўка для прадпрымальніцкай творчасці. За апошнія гады прынята некалькі нарматыўных дакументаў на ўзроўні кіраўніка дзяржавы, якія ствараюць у гэтым рэгіёне дадатковыя ўмовы. І яшчэ летась, калі, на жаль, форум не адбыўся, была патрэба піярыць тэму, — прызнаецца намеснік старшыні аблвыканкама. — Гэтаму кірунку сёлета мы прысвяцілі асобную секцыю. На пленарным пасяджэнні будзем шмат казаць пра гэтыя магчымасці. Будзем гаварыць пра выкарыстанне нашых мясцовых рэсурсаў, пра тую работу, якую праводзім для стварэння інфраструктуры, пра стварэння індустрыяльных пляцоўкі ў розных раёнах, дзе мы сёння гатовы прыняць інвестара».

Інвестфорум — мерапрыемства, дзе можна ўбачыць, як працуе эканоміка вобласці. Дапаможа ў гэтым Магілёўская асацыяцыя прамысłоўцаў і прадпрымальнікаў. Яна, дарэчы, найстарэйшая ў Беларусі: у 2023 годзе ёй споўніцца 30 гадоў.

— Гадоў пяць таму ў асацыяцыі былі толькі дзяржаўныя прадпрыемствы — цяпер з болей чым 100 яе членаў 50 % — прадстаўнікі недзяржаўнай формы ўласнасці, — удакладняе **дырэктар асацыяцыі Віктар КРАСОЎСКІ.** — Гэта «Тэхналіт», «Махіна-ТСТ», група кампаній «Газасілікат», завод «Віктар» і іншыя. Іх прыход даў новы імпульс рабоце асацыяцыі і наогул развіццю Магілёўскай вобласці. Раней прыватнікам было праблематычна дамовіцца з дзяржаўнымі прадпрыемствамі, а калі мы сталі праводзіць выязныя пасяджэнні на прыватных прадпрыемствах, абудзілася цікавасць. Сёння «Баро» супрацоўнічае з «Ольсай», фабрыка «Алмаз-Люкс» — з «Магілёўліфтмашам», «Тэхналіт» — з Магілёўскім мясакамбінатам.



Наогул, прыватны бізнес у Магілёўскай вобласці ўсё больш упэўнена асвойвае розныя сферы дзейнасці. Нядаўна старшынёй аблвыканкама Леанідам Зайцам быў падпісаны план дадатковых мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне ўзаемадзеяння ўлады і бізнесу. У раёнах будуць праведзены дадатковыя семінары, сустрэчы з прадстаўнікамі ўлады і тых органаў, з якімі бізнесмены ўзаемадзейнічаюць. Будзе аказвацца кансультатыўная дапамога.

— Сфера малога і сярэдняга бізнесу ахоплівае сёння 30 % працоўных ад агульнай іх колькасці ў Магілёўскай вобласці, — падкрэслівае Руслан Страхар. — Ствараюцца новыя арганізацыі, больш становіцца індывідуальных прадпрымальнікаў. Толькі за 9 месяцаў у вобласці зарэгістравана 408 новых камерцыйных арганізацый і 2416 ІП. Баланс паміж тымі, хто адкрыўся і закрыўся, склаў на 1 кастрычніка 101,1 % да адпаведнага перыяду мінулага года. Для такога складанага перыяду, як сённяшні, гэта добры знак.

Галоўнае ў такі момант — дапамагчы пачынальнікам. Вялікую ролю выконваюць Саветы па развіцці прадпрымальніцтва, якія сёння створаны як пры аблвыканкаме, так і пры гар- і райвыканкамах. З пачатку года адбылося пяць пасяджэнняў Савета па развіцці прадпрымальніцтва пры аблвыканкаме і 78 пры гаррайвыканкамах. На такія мерапрыемствы запрашаюцца спецыялісты структурных падраздзяленняў аблвыканкама, падатковых, мытных органаў, іншыя эксперты, якія могуць даць кваліфікаваную інфармацыю.

— Дзякуючы сумеснай рабоце, мы бачым станоўчую дынаміку, — дзеліцца Руслан Страхар. — Толькі сёлета сюды па падтрымку звярнулася амаль 9 тысяч кліентаў. З пачатку года праведзена болей чым 260 семінараў на надзённыя тэмы. Развіваецца інавацыйнае прадпрымальніцтва. У вобласці працуе Тэхнапарк «Магілёў» і Тэхналагічны парк «Горкі». Праект апошняга, накіраваны на развіццё аграрнага прадпрымальніцтва, увайшоў у спіс так званых будучых, якія плануецца рэалізаваць у Беларусі на працягу найбліжэйшых пяці гадоў.

Некалькі гадоў таму ў Магілёве прайшло вялікае мерапрыемства па стартапах «Магілёўінвестдэй». Цяпер гэта адно з галоўных мерапрыемстваў, дзе пачаткоўцы маюць магчымасць заявіць пра сябе і нават знайсці спонсараў для рэалізацыі праектаў. Праект заўважылі буйныя бізнесмены Магілёўскай вобласці, што стала нагодай для стварэння інвестклуба «ДЭКРА», які зараз дапамагае бізнесменам-пачаткоўцам фінансамі.

Самазанятасць — таксама рухавік эканомікі. **Намеснік старшыні Камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Павел МАРЫНЕНКА** заўважыў, што ў параўнанні з 2017 годам колькасць самазанятых вырасла больш чым у два разы — да пяці тысяч.

Бізнес развіваецца па спіралі. Галоўнае — адчуць, калі пачнецца новы віток, і не застацца за бортам. Інвестфорум «Млын поспеху» — якраз той выпадак, калі ёсць магчымасць выйсці на новую арбіту і ажыццявіць самыя смелыя ідэі. Невыпадкова пра яго ведаюць за тысячы кіламетраў ад Магілёва. Адным з дакументаў, які сёння будзе падпісаны на пленарным пасяджэнні, стане План мерапрыемстваў на 2022—2023 гады па рэалізацыі Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Магілёўскім аблвыканкамам і выканаўчым органам дзяржаўнай улады Сагдыйскай вобласці Рэспублікі Таджыкістан. У цэлым плануецца падпісаць пратаколаў і дагавораў аб намерах па рэалізацыі інвестпраектаў у Магілёўскай вобласці на суму болей чым 200 мільёнаў долараў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «ВЫ ЗАСНЯЦЕ НА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН, А МЫ БУДЗЕМ ПОБАЧ»

## Як лечаць пацыентаў з цяжкімі формамі COVID-19

**Чацвёртая хваля каранавіруса вызначаецца тым, што ўсё больш пацыентаў хварэе ў цяжкай форме, многім патрабуецца дадатковы кісларод, а часам справа даходзіць да рэанімацыі і штучнай вентыляцыі лёгкіх. Як выходжваюць у бальніцах цяжкіх пацыентаў? Чаму цяпер так шмат кіслародазалежных хворых? Чым адметная і каварная вірусная пнеўманія? Ці можна выжыць са значным паражэннем лёгкіх? У якіх выпадках пацыента пераводзяць у рэанімацыю? І як рэагаваць на навіну пра падключэнне да апарата ШВЛ? Пра гэта і іншае мы паразмаўлялі з кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам кафедры анестэзіялогіі і рэанімацыі БелМАПА, якая працуе ў Гарадской клінічнай бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі, Вольгай СВЯТЛІЦКАЙ.**



### «ЁСЦЬ ПАЦЫЕНТЫ З 95—100 % ПАШКОДЖАННЕМ ЛЁГКІХ»

***— Многія медыкі звяртаюць увагу на тое, што каранавірусная інфекцыя ў чацвёртую хвалю развіваецца больш імкліва, стан пацыента пагаршаецца да цяжкага літаральна за 5-6 дзён. А як развіваецца пнеўманія? Якія ў яе асаблівасці ў гэтую хвалю?***

— Сапраўды, дэльта-штам — гэта чацвёртая за два гады клінічна значная мадыфікацыя каранавіруса, хоць яго мутацыі адбываліся значна часцей. Ён адрозніваецца ад папярэднікаў павышанай кантагіёзнасцю — мае высокую заразнасць і лягчэй перадаецца. Як вядома, каранавірус, калі адлюстроўваюць яго схематычна, быццам усеяны булавападобнымі шыпамі. З іх дапамогай ён далучаецца да рэцэптараў на паверхні нашых клетак. І частка гэтага шыпа муціруе такім чынам, што ў яго з'яўляецца выразнае падабенства з рэцэптарамі нашых клетак. А чым яно большае, тым хутчэй вірус злучаецца з клеткай.

Увогуле, вірус — гэта ўнікальная форма жыцця: як толькі ён далучыўся да рэцэптара і пранік у клетку, ён злучае свой генетычны матэрыял, вірусны геном, з клеткай гаспадара. І як толькі вірус там разгарнуўся, клетка перастае выконваць сваю функцыю, а пачынае сінтэзаваць бялкі, уласцівыя гэтаму вірусу. У выніку клетка напаўняецца вірыёнамі, набухае, разрываецца і гіне. А вірыёны, якія вызваліліся, распаўсюджваюцца на найбліжэйшыя клеткі — так адбываецца далейшае заражэнне.

Такім чынам, чым вышэйшая кантагіёзнасць, тым хутчэй мы заражаемся, паражаецца большая колькасць клетак, адпаведна, яны больш прадуцыруюць вірыёнаў, больш клетак гіне, і мноства вірыёнаў аказваецца ў лёгкіх. Таму чацвёртая хваля значна цяжэйшая, чым папярэднія, і мы назіраем усё больш пацыентаў са значным паражэннем лёгкіх. У рэанімацыях цяпер знаходзяцца людзі, у якіх аб'ём пашкоджання лёгкіх больш за 70 %. Сустракаюцца пацыенты і з 95 % і нават 100 % пашкоджаннем.

***— Ці можна выжыць з такім значным паражэннем лёгкіх?***

— Шанцаў няшмат, але мы змагаемся. Інтэрсціцыяльная, або вірусная, пнеўманія адрозніваецца ад звычайнай. Яна выклікае такі феномен, як востры рэспіраторны дыстрэс-сіндром. Нашы лёгкія складаюцца з альвеол (пузыркоў, напоўненых паветрам. — **«Зв.»**), і праз іх адбываецца паветраабмен. Сценка альвеолы — гэта ўсяго адзін слой пнеўмацытаў, лёгачнага эпітэлію. Альвеолы аплятаюцца капілярамі. І паветраабмен адбываецца праз так званы альвеалярна-капілярны бар'ер. Кісларод, каб патрапіць у нашу кроў, павінен пераадолець гэты лёгачны эпітэлій, але ён вельмі тонкі.

Вірус, трапляючы ў лёгкія, разбурае эпітэлій, папросту кажучы, у альвеолах з'яўляюцца адтуліны. Праз іх вірус трапляе ў кроў і пачынае паражаць ужо эндатэлій сасудаў, што аплятаюць альвеолу. Адтулін з'яўляецца ўсё болей, і вадкасць з капіляраў перацякае ў альвеолы. Там назапашваецца, пачынаецца запаленне. Сценка альвеол патаўшчаецца, і кісларод больш не можа пранікнуць у кроў. Так у пацыента ўзнікае кіслародная залежнасць.

Востры рэспіраторны дыстрэс-сіндром вядомы медыцыне ўжо каля паўстагоддзя. У цэлым ён працякае не менш за тры тыдні. Першы тыдзень — стадыя эксудацыі, гэта выхад вадкасці праз сасудзістую сценку ў альвеолы і яе назапашванне. Праз тыдзень адбываецца ўшчыльненне эксудатаў, а на трэці тыдзень пачынаецца паступовае ачышчэнне альвеол. Наша задача — забяспечыць жыццё чалавека, пакуль ідуць гэтыя працэсы. Калі нам удаецца ўтрымаць пацыента гэтыя тры тыдні, то нават пры вялікім паражэнні лёгкіх ёсць шанец выбрацца.

***— Па сутнасці, з вірусам змагаецца наш імунітэт? Лекаў супраць яго няма?***

— Лепш за ўсё з вірусам сапраўды змагаецца наш імунітэт. Трэба разумець, што вірусы муціруюць, а лекі не паспяваюць за імі, таму добры імунітэт мае значэнне. І ў першую, і ў другую хвалю маладыя людзі з моцным імунітэтам менш хварэлі. Гэтая хваля адрозніваецца тым, што пацыенты памаладзелі. Да таго ж з кожнай хваляй цяжкіх хворых становіцца ўсё больш. У першую хвалю пацыенты былі пераважна некіслародазалежныя, было шмат лёгкіх форм, мы нават маглі дазволіць сабе браць іх на каранцін. У другую хвалю бралі больш складаныя формы. У першую хвалю было шмат пажылых людзей 75–80 гадоў. У другую-трэцюю былі пацыенты 65—75 гадоў. У гэтую хвалю, на жаль, шмат людзей 60—70-х гадоў нараджэння. Сярэдні ўзрост у рэанімацыі — каля 55 гадоў. Больш стала і маладзейшых — 30—40-гадовых. Мы звязваем гэта з мутацыяй віруса.

***— Пацыенты сталі больш кіслародазалежныя?***

— Так, гэта звязана з большым аб'ёмам паражэння лёгкіх. Па сутнасці, чым ён большы (гэтыя ўчасткі візуалізуюцца на КТ як матавае шкло), тым большая імавернасць, што чалавек будзе кепска дыхаць. Бо, акрамя таго, што маецца сам востры рэспіраторны дыстрэс-сіндром з паражэннем альвеалярна-капілярнага бар'еру, тут яшчэ ярка выражана тромбаўтварэнне ў сасудах лёгкіх. З-за таго, што вірус пранікае ў кроў і пашкоджвае эндатэлій сасудаў, у гэтых месцах пачынаюць збірацца трамбацыты — клеткі крыві, якія імкнуцца ліквідаваць гэтае пашкоджанне. На самай справе гэта нармальная фізіялагічная рэакцыя арганізма, але тут яна атрымлівае паталагічнае развіццё. Усе маленькія сасуды, якія аплятаюць альвеолу, забітыя трамбацытамі, там фарміруюцца маленькія і вялікія тромбы. І яны перашкаджаюць цыркуляцыі крыві. І нават калі альвеола ўсё яшчэ жывая, усё роўна газаабмену не адбываецца, бо кроў не рухаецца. Таму тут дваякая вострая дыхальная недастатковасць, і людзі становяцца ўсё больш кіслародазалежныя.

### «40—45 % ПАРАЖЭННЯ — ГЭТА ПЕРШЫ КРОК ДА КІСЛАРОДУ»

***— Калі чалавек трапляе ў стацыянар, па якіх крытэрыях вызначаюць, дзе яго будуць лячыць: у тэрапіі з кіслароднай маскай або ў рэанімацыі са штучнай вентыляцыяй лёгкіх?***

— У здаровага чалавека сатурацыя, якая вызначае ступень насычэння крыві кіслародам, ад 97 % і вышэйшая. Калі пры пнеўманіі яна 95 % і больш, мы лічым гэта выдатным варыянтам. Непакой выклікае, калі яна пачынае зніжацца. І першае, што мы робім у стацыянары, — укладка ў прон-пазіцыю. Ляжаць на жываце пацыентам карысна зноў-такі з-за тромбаўтварэння. Часцей за ўсё пашкоджваюцца задне-ніжнія аддзелы лёгкіх, і пры прон-пазіцыі кроў спускаецца ўніз, а гэтыя аддзелы лепш вентылююцца. Выкарыстоўваючы прон-пазіцыю, лягчэй змагацца з любой пнеўманіяй. Многім пацыентам гэтага дастаткова: у прон-пазіцыі ў іх павышаецца сатурацыя. Трэба сказаць, што ўсе нашы рэанімацыйныя пацыенты мусяць знаходзіцца ў ёй не менш за 16 гадзін у суткі. Людзям, якія лечацца дома, таксама рэкамендуецца перыядычна ляжаць на жываце.

Калі сатурацыя не мяняецца ці першапачатковая меншая за 92 %, мы выкарыстоўваем назальныя катэтары ці кіслародную маску. Самы просты метад — назальныя катэтары — трубачкі з кіслародам, якія падводзяцца ў нос. У атмасферным паветры, якім мы ўсе дыхаем, 21 % кіслароду, яны ж могуць забяспечыць каля 40 %. Пацыент з такімі катэтарамі ўдыхае паветра, і да яго прымешваецца паток кіслароду аб'ёмам ад пяці да 15 літраў у хвіліну — такім чынам удаецца стварыць канцэнтрацыю ў 40—45 %. Чым больш кіслароду паступіць у лёгкія, тым большай, можна спадзявацца, будзе дыфузія газаў.

Аднак насавыя катэтары — сістэма негерметычная, частка кіслароду можа губляцца, ды і такія пацыенты нярэдка дыхаюць праз рот. Тады выкарыстоўваюцца маскі на твар. Кісларод таксама падаецца праз трубачкі, але маска шчыльна прылягае да твару, і тут канцэнтрацыя можа дасягаць ужо 55—60 %. Гэтыя метады выкарыстоўваюцца ў тэрапеўтычных аддзяленнях, дзе маецца вывад кіслароду на сцяне. Але тут ёсць абмежаванні: складана развіць паток кіслароду больш за 60 %, сярэдні ўзровень — 50—55 %.

***— З якой ступенню паражэння лёгкіх наступае кіслародазалежнасць?***

— Калі ў чалавека пашкоджанне крыху менш за палову лёгкіх — 40—45 %, гэта першы крок у бок кіслароду. Пацыенты з меншым пашкоджаннем не з'яўляюцца кіслародазалежнымі. Аднак могуць імі станавіцца, прычым не столькі з-за разбурэння лёгкіх, колькі з-за тромбаўтварэння. Таму яны атрымліваюць антыкаагулянты.

Калі аб'ём паражэння лёгкіх павялічваецца да 50—60 %, узрастае кіслародазалежнасць. Больш цяжкімі становяцца пашкоджанні альвеалярна-капілярнага бар'еру, назальныя катэтары і маскі ўжо не спраўляюцца. Патрэбны большы паток і ціск кіслароду. Рэч у тым, што пашкоджаныя клеткі лёгкіх не могуць прадуцыраваць сурфактант, які не дае зліпацца сценкам альвеол. У выніку яны страчваюць аб'ём і сціскаюцца ці напаўняюцца вадкасцю. Раскрыцца самі альвеолы ўжо не могуць, дапамагаюць гэта зрабіць штучныя метады вентыляцыі.

Тут тры этапы. Першы — высокапаточная кіслародатэрапія, другі — неінвазіўная вентыляцыя лёгкіх, трэці — інвазіўная вентыляцыя. На двух апошніх задзейнічаны апараты ШВЛ. Для першага этапу ў нас ёсць адмысловае абсталяванне, якое было дастаўлена ў Беларусь. Амаль у кожнай рэанімацыі маюцца адзінаццаць такіх высокапаточных апаратаў. Пацыенту надзяваюцца ўжо больш аб'ёмныя кіслародныя катэтары, паветра абаграваецца і з большай сілай падаецца ў дыхальныя шляхі. Калі ў тэрапеўтычных аддзяленнях паток кіслароду развівае аб'ём максімум 20 літраў у хвіліну, то тут — ад 30 да 60 літраў у хвіліну. Такі паток паветранай кіслароднай сумесі стварае ціск у дыхальных шляхах і раскрывае альвеолы, якія зліпліся. Раскрыўшы такім чынам на «высокапаточніку» альвеолы, з'яўляецца шанц, што ў іх трапіць паветраная кіслародная сумесь. Некаторым пацыентам гэтага хапае. Нядаўна мы выпісалі 43-гадовага мужчыну, які сем дзён знаходзіўся ў нас на высокапаточным кіслародзе, і гэта дапамагло яму паправіцца.

Калі гэтага не хапае, наступны этап — неінвазіўная вентыляцыя лёгкіх. Яна ажыццяўляецца з дапамогай шчыльна прылягаючай маскі, якая фіксуецца з дапамогай стужак. Яшчэ выкарыстоўваецца СІПАП-шлем, ён выглядае як мяшок, які фіксуецца падпахай. Яны цалкам герметычныя, у лёгкія трапляе толькі паветрана-кіслародная сумесь з апарата ШВЛ. Гэта таксама дапамагае стварыць станоўчы ціск у дыхальных шляхах і расправіць пашкоджаныя альвеолы. У шэрагу выпадкаў гэта дазваляе чалавеку выжыць.

Калі пацыент знясілены і не можа дыхаць сам, прыходзіцца яго інтубіраваць. Ёсць крытэрыі, па якіх мы вызначаем, што самастойнае дыханне далей немагчыма. З дапамогай ларынгаскопа ўводзім спецыяльную эндатрахеяльную трубку ў дыхальнае горла. Гэта адбываецца пад анестэзіяй, чалавек знаходзіцца ў медыкаментозным сне. Далучаем яго да апарата штучнай вентыляцыі. А далей мадэлюем працэс дыхання з улікам паражэння лёгкіх. У нас ёсць высокаінтэлектуальнае дыхальнае абсталяванне, якое дазваляе ацаніць, наколькі пашкоджаны лёгкія, як іх трэба «раздзьмуць» і як найлепшым чынам змадэляваць дыхальны цыкл гэтага пацыента. У медыкаментозным сне ён знаходзіцца некалькі дзён, прычым першыя 48 гадзін мы стараемся, каб ён не рабіў удыхаў. Ён знаходзіцца ў прон-пазіцыі, і за яго дыхае апарат.

### «САМАЙ ПАЖЫЛОЙ ПАЦЫЕНТЦЫ, ЯКУЮ ВЫРАТАВАЛІ НА ШВЛ, БЫЛО 80»

***— Як пацыенты рэагуюць на перавод на апарат ШВЛ?***

— Мы абавязкова размаўляем з імі перад гэтым. Яны ў свядомасці, мы тлумачым, што вы засняце на некалькі дзён, а мы будзем побач. Некаторыя пацыенты панікуюць, і патрабуецца шмат эмацыянальных намаганняў, каб супакоіць іх. Увогуле, калі чалавек не можа дыхаць, у яго развіваецца паніка. Такія людзі часта і самі пагаджаюцца, бо яны стаміліся і разумеюць, што не могуць дыхаць самастойна.

Мы ўводзім у медыкаментозны сон, даём абязбольванае. З ім працуе рэанімацыйная брыгада. Догляд складаны, гэта штучная работа. Калі нам удаецца выратаваць пацыента, гэта вялікае шчасце. Востры рэспіраторны дыстрэс-сіндром — не насмарк, а найцяжэйшая форма дыхальнай недастатковасці, і такі чалавек знаходзіцца на ШВЛ не менш за 10—12 сутак, часта — два–тры тыдні і нават больш.

***— Гэта своеасаблівая перадышка для арганізма, каб ён аднавіўся і справіўся з хваробай?***

— Так, бо дыханне — вельмі энергазатратны працэс, і калі ў чалавека цяжкая пнеўманія, ён прыкладае ўсё больш намаганняў, губляе шмат энергіі і сіл. Калі змадэляваць дыханне з дапамогай ШВЛ, мы выйграем час, каб лёгкія аднавіліся. Гэта вельмі тонкая работа па выхаджванні такіх пацыентаў, і тут нельга спяшацца.

Самы пажылы чалавек, якога мы паспяхова знялі з апарата ШВЛ, — наша 80-гадовая Ізабэла Канстанцінаўна. На штучнай вентыляцыі яна правяла ў рэанімацыі 18 сутак, з якіх 4 знаходзілася ў поўным медыкаментозным сне ў прон-пазіцыі. У яе быў цяжкі рэспіраторны дыстрэс-сіндром, аб'ём паражэння лёгкіх — 80 %. Цяпер яна праходзіць рэабілітацыю ў Гарадзішчы. А самы доўгі час штучнай вентыляцыі — 38 дзён, аднак мужчына паправіўся і самастойна пакінуў бальніцу. І такіх выпадкаў, калі пацыентаў паспяхова ўдаецца зняць з ШВЛ, дастаткова.

**Алена КРАВЕЦ.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

5 лістапада 2021 г. № 43 (628)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ?

## БЯСПЕКА — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

Экспертны савет пры Савеце Рэспублікі разгледзеў тэму аўтаперавозак пасажыраў

**НЕАБХОДНАСЦЬ змены падыходаў да рэгулявання аўтамабільных перавозак пасажыраў абгрунтоўваецца перш за ўсё пытаннямі забеспячэння бяспекі людзей. Гэта адзначана на пасяджэнні экспертнага савета пры Савеце Рэспублікі, які прайшоў пад старшынствам спікера верхняй палаты парлмента Наталлі КАЧАНАВАЙ.**

стар. 8



Фота БелТА.

ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ

# ЧЫСЦІНЯ НАВОКАЛ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

Месячнік па прыбіранні і азеляненні Мінска працягнуты да 15 лістапада. У чым інтрыга?



Фота Ірыны СІДАРОК.

**— Самае, бадай, цікавае, што прапановы на гэты конт сталі паступаць ад мінчан у раённыя адміністрацыі горада, як гаворыцца, з месцаў. Людзі казалі, што яны толькі разгарнуліся і ўвайшлі ў смак, а тут трэба ўжо заканчваць, хоць надвор'е дазваляе яшчэ пагаспадарыць на зямлі, у прыватнасці, лістоты на дрэвах яшчэ шмат, на яе прыбіранне спатрэбіцца дадатковы час. Гэта, відаць, як апетыт, які прыходзіць падчас ежы, — кажа старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Андрэй БУГРОЎ. — Дэпутаты гарсавета разам з кіраўнікамі раённых адміністрацый Мінска абагульнілі гэтыя прапановы і выйшлі з адпаведнай ініцыятывай у гарвыканкам. Там ідэю падтрымалі. Такая вось гісторыя працягу месячніка, і аніякай інтрыгі тут няма.**

стар. 17

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## Транспарт — у цэнтры ўвагі

**Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў.**

У цэнтры ўвагі былі пытанні функцыянавання транспартнага комплексу ў 2021 годзе і планы на 2022 год. Асаблівая ўвага ўдзельнікаў пасяджэння была ўдзелена знешнеэканамічнай дзейнасці ў сферы транспарту, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.

Таксама на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў удзельнікі абмяркавалі гатоўнасць галіны да рэалізацыі найважнейшых інвестыцыйных праектаў.

АКТУАЛЬНА

**Таццяна РУНЕЦ:**

## «Нельга спакойна назіраць за гібеллю мірных грамадзян на граніцы!»

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, член прэзідыума Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза жанчын:**

— Сітуацыя, якая складваецца на заходніх граніцах нашай краіны, не можа не выклікаць трывогу і заклапочанасць. Бо штучна раздзьмуты польскімі ўладамі міграцыйны крызіс, падчас якога да мірных бежанцаў прымяняюцца метады ўздзеяння, якія шакіруюць сваёй жорсткасцю (людзей цкуюць сабакамі, травяць слёзатачывым газам, збіваюць і зневажаюць, не аказваюць медыцынскай дапамогі), прыводзіць толькі да аднаго — гібелі ні ў чым не павінных мірных грамадзян.

Гэтымі дзеяннямі Варшава не толькі парушае артыкулы сваёй канстытуцыі, якія гарантуюць правы і свабоды грамадзян, але і асноўныя міжнародныя нормы, у тым ліку Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Канвенцыю супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжальных годнасць відаў абыходжання і пакарання, а таксама парушае Еўрапейскую канвенцыю аб абароне правоў чалавека і асноўных свабод.

Такім неапраўдана жорсткім і бесчалавечным стаўленнем да мігрантаў, сярод якіх ёсць малалетнія дзеці, цяжарныя жанчыны, нямоглыя старыя, аслабленыя хваробай людзі, польскае кіраўніцтва здзяйсняе злачынствы супраць чалавечнасці, парушаючы тым самым міжнароднае права.

Пры гэтым людзі, да якіх прымяняюцца жахлівыя меры гвалту, бягуць ад вайны і разрухі ў сваіх краінах. Яны хочуць спакойнага і мірнага жыцця там, дзе яна ім бачыцца, але ў выніку сутыкаюцца з сапраўднай жорсткасцю.

Таму і невыпадкова бесчалавечная, варварская і цынічная пазіцыя афіцыйнай Варшавы ў дачыненні да бежанцаў выклікае справядлівае абурэнне ў многіх краінах свету. Якімі б ні былі матывы палітычнай эліты, яны не апраўдваюць гібель ні ў чым не павінных людзей! І рашэнне міграцыйнага крызісу бачыцца не ў забойстве і ў бесчалавечным стаўленні да мігрантаў, а ў выкарыстанні сучаснага інструментарыю работы з імі і ў перагаворным працэсе паміж палітыкамі розных краін. Калі ж, нарэшце, гэта зразумеюць польскія палітыкі і пачнуць пераглядаць сваю стратэгію ў дачыненні да бежанцаў?

# БЯСПЕКА — ПЕРШ ЗА ЎСЁ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

— Сёння мы разглядаем важнае пытанне — аб аўтамабільных перавозках пасажыраў. Гэта пытанне, якое датычыцца многіх жыхароў нашай краіны, прадпрыемстваў, — падкрэсліла яна, адкрываючы пасяджэнне. — Мы запрасілі да ўдзелу ў пасяджэнні савета людзей, якія непасрэдна займаюцца гэтай сферай, намеснікаў і кіраўнікоў прадпрыемстваў транспарту. Выслухаем усіх, каб прыняць абсалютна правільнае рашэнне.

Нагадаем, што з улікам Дэкрэта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 7 «Аб развіцці прадпрымальніцтва» для аказання паслуг па ўнутрырэспубліканскіх перавозках пасажыраў і багажу аўтамабільным транспартам у нерэгулярных зносінах, у тым ліку аўтамабілямі-таксі, атрыманне спецыяльнага дазволу (ліцэнзіі) не патрабуецца, нагадалі ў прэс-службе верхняй палаты парламента. Для пачатку ажыццяўлення такой дзейнасці прадугледжаны паведамляльны прынцып, які спрасціў для суб'ектаў гаспадарання працэдуру ўваходжання на рынак перавозак.



Бывае і так: рукі кіроўцу патрэбныя для карыстання мабільным дадаткам. А як жа бяспека пасажыраў, спытаеце?

Разам з тым нядобрасумленныя перавозчыкі адмену ліцэнзавання такіх відаў перавозак пасажыраў успрынялі як усёдазволенасць і магчымасць не выконваць устаноўленыя заканадаўствам патрабаванні да аўтамабільных перавозчыкаў, лічаць у Савеце Рэспублікі.

Агучаная тэндэнцыя пацвярджаецца вынікамі праверак, якія рэгулярна праводзяцца транспартнай інспекцыяй.

Так, калі параўноўваць даныя за мінулы і пазамінулы гады, а таксама інфармацыю з сёлетняга першага квартала, становіцца зразумелай заклапочанасць сенатараў сітуацыяй у гэтай сферы.

Калі ў 2019-м колькасць парушэнняў правілаў перавозкі складала 3828, то летась яна дасягнула 6881. З гэтай колькасці парушэнняў уплывалі на бяспеку 556 (у 2019-м) і ў тры разы вышэй у 2020-м — 1525.

Паводле звестак транспартнай інспекцыі, летась з удзелам перавозчыкаў аўтамабілямі-таксі адбылося 76 ДТЗ з пацярпелымі (46 — у 2019 годзе), колькасць якіх склала 92 чалавекі (59 — у 2019 годзе), загінулі 16 чалавек (7 чалавек годам раней).

### Даведка «МС»

Экспертны савет пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі з'яўляецца эфектыўным механізмам павышэння якасці заканапраектаў і стратэгічнай ацэнкі ўздзеяння нарматворчай дзейнасці на развіццё нашай краіны.

— На сёння пытанне аб аказанні паслуг па перавозцы пасажыраў досыць актуальнае з прычыны паступлення абгрунтаваных скаргаў ад жыхароў горада на бязладную паркоўку аўтамабіляў маршрутных таксі нелегальных перавозчыкаў у дварах жылых дамоў, уздоўж тратуараў, — расказала **намеснік старшыні камітэта эканомікі Мінгарвыканкама Вольга ЛЯВОШКА.**

Паводле яе слоў, нелегальныя перавозчыкі ажыццяўляюць дзейнасць без праходжання тэхагляду аўтамабіля, не маюць адпаведных знакаў, не выконваюць правілы хуткаснага рэжыму, не выплачваюць падаткі, у іх няма дагавора сацыяльнага страхавання адказнасці перад пасажырамі.

— Так, цяпер мы маем дастаткова нізкі кошт праезду ў таксі па горадзе, — згодна яна, але з жалем звяртае ўвагу на адваротны бок гэтай з'явы: ёсць выпадкі перавозкі пасажыраў кіроўцамі аўтамабіляў-таксі, у якіх наогул няма вадзіцельскага пасведчання, вопыт работы складае адзін—тры месяцы.

Спецыяліст перакanана, што неабходнасць навядзення парадку ў гэтай сферы выклікана перш за ўсё неабходнасцю забеспячэння бяспекі аўтамабільных перавозак, павышэння якасці паслуг, а таксама выключэння шэрага рынку аказання паслуг. Што маецца на ўвазе? Для зніжэння выдаткаў і атрымання эканамічных пераваг аўтамабільныя перавозчыкі звяртаюцца да схем, якія прыводзяць у тым ліку да недаатрымання ў поўным аб'ёме падаткаў, а таксама ўзносаў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, парушэння правоў спажыўцоў, дэстабілізацыі абстаноўкі на рынку паслуг.

— Бо сёння тыя суб'екты гаспадарання, хто працуе ў прававым полі, таксама скардзяцца на нядобрасумленную канкурэнцыю, — рэзюмуе спецыяліст.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота аўтара.**

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# ПРЫЁМЫ І МЕТАДЫ РОЗНЫЯ, ВЫНІК — АДЗІН

## Віцэ-спікер Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА правёў прамую лінію

**ГЭТУЮ форму зносін з людзьмі парламентарый лічыць эфектыўным і зручным спосабам камунікацыі грамадзян з прадстаўнікамі ўлады. Такое меркаванне ён выказаў у гутарцы з журналістамі пасля правядзення прамой тэлефоннай лініі, якую правёў 2 лістапада.**

Віцэ-спікер звярнуў увагу на эфектыўнасць правядзення прамых ліній, якія зарэкамендавалі сябе як зручны і хуткі для грамадзян і юрыдычных асоб спосаб звароту ў дзяржаўныя органы.

— Мы працягваем зносіны з людзьмі па розных пытаннях. Прыёмы і метады розныя: прамая тэлефонная лінія, асабістыя прыёмы грамадзян на месцах, адзіныя дні прыёму сенатарамі ў рэгіёнах, выязныя прыёмы, стрымы ў сацыяльных сетках — усе формы зарэкамендавалі сябе добра, — лічыць Анатоль Ісачанка. — Што датычыцца такой формы зносін, як прамая тэлефонная лінія, на мой погляд, гэта найбольш хуткі спосаб камунікацыі з насельніцтвам. Па-першае, людзі могуць дазваніцца з розных рэгіёнаў, прыязджаць для гэтага неабавязкова. Па-другое, улічваючы эпідэміялагічную сітуацыю, гэта мінімізуе колькасць кантактаў і рызыку заражэння. Акрамя таго, дазваляе прыняць больш людзей.

Паводле яго слоў, традыцыйна за час, адведзены на правядзенне прамой лініі, атрымліваецца дазваніцца 25—35 заяўнікам, а спроб дазвонаў фіксуецца значна больш.

Намеснік старшыні Савета Рэспублікі звярнуў увагу на тое, што сістэма работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, якая створана ў Рэспубліцы Беларусь, носіць комплексны характар. У яе ўцягнутыя ўсе органы дзяржаўнай улады: дэпутаты мясцовых Саветаў, парламентарыі, Савет Міністраў і іншыя зацікаўленыя.

— І гэта дае свой станоўчы эфект, — перакананы Анатоль Ісачанка. — Самае галоўнае, на мой погляд, што мы ўсе разам працуем на адзін вынік: каб як мага больш



Фота БелТА.

людзей, што звярнуліся да нас, атрымалі станоўчае вырашэнне таго ці іншага пытання.

Ён таксама адзначыў, што звароты, якія трапляюць у дзяржаўныя органы, знаходзяцца на дбайным кантролі.

Што датычыцца цяперашняй прамой лініі, намеснік старшыні Савета Рэспублікі адзначыў, што агучаныя пытанні закранаюць шырокі спектр тэм: ад асабістых праблем да прапаноў па ўнясенні змяненняў у заканадаўства.

— Тэмы традыцыйныя, пачынаючы ад вырашэння зямельных пытанняў і функцыянавання жыллёва-камунальнай гаспадаркі да больш глабальных пытанняў, калі людзі выходзяць з заканадаўчымі ініцыятывамі, — рэзюмаваў віцэ-спікер Савета Рэспублікі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ ПАЧУЦЬ АБ ПРАБЛЕМАХ

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла асабісты прыём грамадзян.**



Гэтая форма работы з грамадзянамі часам дорыць сенатарам нечакана цікавыя спатканні і глыбокія па змесце гутаркі на актуальныя для нашай краіны і яе жыхароў тэмы. Мінчанін Дзяніс Алегавіч загадзя паведаміў супрацоўнікам верхняй палаты парламента, якія адказваюць за сувязі з грамадскасцю, што ёсць шэраг вельмі важных прапаноў па развіцці эканомікі. На прыём ён прыйшоў разам з жонкай, відаць, яго паплечнікам і аднадумцам у дыскусіях наконт эканамічнай будучыні Беларусі.

Прызнаемся, што цяжка большменш падрабязна перадаць усю сутнасць маналогу Дзяніса Алегавіча, які імкнуўся ахапіць як мага больш шырокае кола пытанняў. Тым не менш пастараемся тэзісна пазначыць асноўныя моманты прамовы наведвальніка. Ён не выказваў радыкальных рэчаў тыпу «эканоміка ў небяспецы», не патрабаваў паўсюднай прыватызацыі, а выкладаў свае падыходы да вырашэння пэўных праблем. У прыватнасці, наконт «утаймавання» інфляцыі, аб удасканаленні работы з інвестарамі, паляпшэнні практыкі эканамічных судоў. Таксама раіў сенатарам больш клапаціцца пра айчынны бізнес, а дзеля гэтага не спяшацца з унясеннем змен у дзеючыя законы, каб не блытаць прадпрымальнікаў. І яшчэ рэкамендаваў уважліва вывучаць, асэнсоўваць замежны досвед і найлепшае ўкараняць у нашу рэчаіснасць.



Паступова маналог ператварыўся ў дыялог. Таццяна Рунец з нечым пагаджалася, з нечым спрачалася. У рэшце рэшт прапанавала паўдзельнічаць у круглых сталах на тэму эканомікі.

Потым у размове з журналістамі старшыня Пастаяннай камісіі расказала, што для яе і калег па Савеце Рэспублікі важна з першых вуснаў пачуць аб праблемах, якія падчас асабістых прыёмаў і прамых тэлефонных ліній агучваюць грамадзяне.

— Усе звароты да нас мы імкнёмся ўважліва разглядаць, і аператыўна рэагаваць на ўзнятыя пытанні, — падкрэсліла яна. — Што датычыцца сённяшняга звароту, то прыемна адзначыць, якія адукаваныя і неабыякавыя людзі жывуць у нашай краіне. Ім сапраўды шчыра хочацца сваімі парадамі і рэкамендацыямі палепшыць эканоміку, стан яе прамысловасці, спыніць рост цэн, мінімізаваць інфляцыю і г. д. І гэта вельмі радуе.

**Мікалай ЛЮБЧАНСКІ, фота аўтара.**

# АСОБА Ў ГУЧАННІ МЕЛОДЫЙ І ЛЁСАЎ

**У лістападзе канал «Культура» Беларускага радыё правядзе серыю перадач, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння народнага артыста СССР, прафесара Віктара Роўды.**

Віктара Уладзіміравіча называлі патрыярхам. Такой яго асоба з'яўлялася не толькі ў айчынным харавым мастацтве: ён быў сапраўды жывым класікам, чалавекам высокай культуры і захавальнікам традыцый, сведкам гістарычных зрухаў XX стагоддзя і яго равеснікам, разам з тым чалавекам надзіва сучасным, бескампрамісным, для якога творчасць заўсёды была сэнсам жыцця. Пасля работы ў Маскве ў хоры знакамітага рускага дырыжора Аляксандра Свешнікава Віктар Роўда вярнуўся ў Беларусь. Пачаў працаваць у Дзяржаўнай харавой капэле Рыгора Шырмы, а потым узначаліў Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі, якім кіраваў больш за сорак гадоў.

У радыёфондзе захавалася размова з Віктарам Уладзіміравічам, дзе ён згадвае сваё дзяцінства, жыццёвыя пуцявіны і шлях да духоўнай музыкі. Запіс гэтай размовы можна будзе пачуць у праграме «Музычная студыя» 6 лістапада ў 13.00.

А 20 лістапада ў гэтым жа радыёпраекце пра свайго настаўніка раскажа дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Інеса Бадзяка. З першага курса кансерваторыі яна трапіла не толькі ў клас маэстра, але і ў заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь — Акадэмічны хор Белтэлерадыёкампаніі, дзе пачала працаваць хармайстрам, непасрэднай памочніцай Віктара Уладзіміравіча. Сёння Інеса Бадзяка ўзначальвае кафедру харавога дырыжыравання акадэміі музыкі: ініцыятар шматлікіх айчынных праектаў, яна вядзе акадэмічны хор студэнтаў, які атрымаў мноства ўзнагарод на прэстыжных конкурсах.

27 лістапада ў 13.00 на канале «Культура» прагучыць канцэрт Акадэмічнага хору Белтэлерадыёкампаніі і хору студэнтаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Дырыжоры — Інеса Бадзяка і сённяшні мастацкі кіраўнік творчага калектыву Белтэлерадыёкампаніі Андрэй Саўрыцкі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 132

Сваю задачу-мініяцюру даслаў наш чытач з Брэста Віктар Жук *(гл. дыяграму)*.



**Белыя:** Kph1, Лb4, Cc2, Cg3, Ke4 (5).
**Чорныя:** Kpe2, пb6 (2).
Мат за 3 хады.

Прапануем чытачам дадзеную задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Некалькі нашых суайчыннікаў узялі ўдзел у традыцыйным турніры ў Санкт-Пецярбургу — Мемарыяле славутага расійскага шахматыста Міхаіла Чыгорына. Мы яшчэ вернемся да гэтай тэмы, а пакуль — цікавыя партыі.

Аляксей Аляксандраў — Ксенія Зелянцова. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. Kc3 Cg7 4. e4 d6 5. f3 0-0 6. Ce3 c6 7. Фd2 a6 8. h4 b5 9. h5 Kbd7 10. hg fg 11. Лd1 Фc7 12. Kh3 Kh5 13. Kg5 Kdf6 14. Ke2 Ch8 15. g4 Kg7 16. Kg3 Ke6 17. K:e6 C:e6 18. d5 Cd7 19. g5 Ke8 20. f4 Лb8 21. Лc1 c5 22. b3 e5 23. Фh2 Cg4 24. f5 gf 25. K:f5 C:f5 26. ef Л:f5 27. Ch3 Лf3 28. Ce6+ Kpf8 29. Kpe2 e4 30. Лcf1 bc 31. Фh4 Kf6 32. gf C:f6 33. Ф:e4 Л:f1 34. Л:f1 Фg7 35. Фh4, 1:0.

Герман Базееў — Аляксей Фёдараў. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. g3 c5 4. dc Фa5+ 5. Kc3 Cg7 6. Cg2 Kc6 7. Cd2 Ф:c5 8. Фa4 0-0 9. Лc1 Ke5 10. Фb5 Ф:b5 11. K:b5 a6 12. Ka3 d5 13. cd Cf5 14. Kc4 K:c4 15. Л:c4 Лac8 16. Лb4 Лc2 17. Kf3 K:d5 18. Л:b7 Ce4 19. Лd7 Л:b2 20. 0-0 Kb6 21. Л:e7 C:f3 22. C:f3 Л:d2 23. Лc1 Лfd8 24. Лa7 Л:a2 25. Лcc7 Лf8 26. Cg4 Cd4 27. Лab7 Ka4 28. e3 Ce5 29. Лc4 Kc3 30. Лc5 Cf6 31. Лcc7 Ke4 32. Cf3 K:f2 33. Cd5 Kh3+ 34. Kph1 Лa1+ 35. Kpg2 Kg5 36. h4 Ce5 37. Лd7 Ke6 38. Л:f7 Л:f7 39. C:e6 Лf1 40. Лa7 Лf2+ 41. Kph3 Kpg7 42. C:f7 Л:f7, 0:1.

Максім Царук — Уладзімір Япішын. 1. e4 c5 2. Kf3 Kc6 3. d4 cd 4. K:d4 Фb6 5. Kb3 Фc7 6. Kc3 e6 7. f4 a6 8. Ce3 b5 9. a3 Лb8 10. Ce2 d6 11. 0-0 Kf6 12. Фe1 Ce7 13. Фg3 0-0 14. Лad1 b4 15. ab Л:b4 16. f5 Kph8 17. Cc5 Л:e4 18. C:d6 Фa7+ 19. Фf2 Ф:f2+ 20. Л:f2 Лe3 21. Cf4 Л:c3 22. bc Ke4 23. Лf3 Cf6 24. fe C:e6 25. C:a6 K:c3 26. Лd6 Kb4 27. Л:e6, 1:0.

* * *

На турніры ў Ерэване (129 удзельнікаў) Міхаіл Нікіценка заняў 18-е месца, Вячаслаў Зарубіцкі — 33-е. Раман Лаўрэцкі фінішаваў восьмы ў Новым Урэнгоі. Дзяніс Лазавік заняў другое месца ў Мемарыяле Яўгена Свешнікава, які праводзіўся анлайн.

У бліцтурніры на сайце chess.com (468 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік быў чацвёрты, Сяргей Жыгалка — дваццаты. У другім турніры на тым жа сайце (454 удзельнікі) гэтыя шахматысты занялі адпаведна 15-е і 19-е месцы, а Уладзіслаў Кавалёў быў сёмы.

* * *

Славацкая арганізацыя па шахматнай кампазіцыі абвясціла два міжнародныя конкурсы і запрашае да ўдзелу беларускіх складальнікаў.

1. Юбілейны конкурс «Васіль Дзячук — 50» у двух раздзелах: а) двуххадоўкі (суддзя — В. Дзячук); б) «казачныя» двуххадоўкі, дзе дазволены любыя казачныя фігуры і ўмовы (суддзя — Ю. Брабец). Задачы неабходна дасылаць не пазней за 27 сакавіка 2022 года.

2. Юбілейны конкурс «Золтан Лабаі — 80»: двуххадоўкі (суддзя — Ю. Брабец). Тэрмін — не пазней за 1 кастрычніка 2022 года.

Задачы на абодва конкурсы трэба дасылаць на адрас арганізатара: Ivan Jarolhn, ijarolin@gmail.com.

* * *

Задача П. Задаяннага з мінулага выпуску рашаецца 1. Лd6. Не вядуць да мэты спробы 1. Лd5+? Kpe4! або 1. Kd4+? Kpg6! Кампазіцыі С. Дарошчанкі: № 1. 1. Ch5. № 2. 1. Фg7. Першыя правільна адказалі Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Сяргей Цяльпук, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**







Будзем знаёмыя

# Уключайся і дзейнічай!

**Каманда праграмы «Уключайся!», што выходзіць на тэлеканале «Беларусь 2», папоўнілася. Новым гульцом у камандзе праекта стаў вядомы прыхільнікам радыёстанцыі «Радыус-FM», вядучы Арцём СЯМЁН. Пра пашырэнне прафесійных гарызонтаў і сваё існаванне ў эфіры і па-за ім мы распыталі ў яго самога.**



Калі хто цікавіўся біяграфіяй Арцёма, то ён з тых людзей, каго жыццё спачатку закінула ў банкаўскую сферу, але потым творчасць усё ж узяла сваё.

— Я з дзяцінства спяваў і выступаў на сцэне, таму работа з публікай і з мікрафонам для мяне не была незнаёмай. Таксама і ва ўніверсітэце ўдзельнічаў у арганізацыі розных вечарын. І калі мой калега ў банку (з ім мы вучыліся на адным курсе) запрапанаваў аднойчы паспрабаваць весці мерапрыемствы, я згадзіўся. Два гады мы працавалі ў рэжыме сумяшчэння: па буднях — у банку, а пасля — на святах, — успамінае Арцём.

Пасля хлопец убачыў у сацыяльнай сетцы аднаго знаёмага абвестку, што на радыёстанцыі шукаюць вядучага. І, прызнаецца Арцём, паколькі жыве па прынцыпе «лепш паспрабаваць, і няважна, як атрымаецца, чым увогуле не зрабіць», вырашыў дзейнічаць. Даслаў сваю анкету і галасавы файл з самапрэзентацыяй. Так і стаў вядучым ранішняга шоу «Тэорыя вялікай раніцы» на «Радыус-FM». Там хлопец працуе ўжо без нечага год, але хто ж ведаў, што аднойчы, апынуўшыся ў кадры ў якасці героя, Арцём атрымае прапанову стаць часткай каманды, якая непасрэдна стварае праграму «Уключайся!».

— Мы з калегам тады прыйшлі на праграму ў якасці гасцей. Здымкі доўжыліся, можа, хвілін дзесяць, — распавядае Арцём. — А потым праз нейкі час мне патэлефанавалі з прапановай паспрабаваць сябе ў ролі вядучага. Работа ў кадры і ў радыёэфіры — яны ў многім падобныя, што дапамагае мне асвоіцца ў новай ролі. Адрозненні, у сваю чаргу, дапамагаюць мне здабыць новы вопыт. Жаданне вывучыць гэтую сферу і з'яўляецца маёй матывацыяй прыйсці на тэлебачанне.

Пасля першага эфіру вядучы адчуў, што працаваць у кадры яму падабаецца. Але, як ён сам адзначае, спасцігаць нюансы даводзіцца ў працэсе, паколькі тут няма рэпетыцый: прыходзіш і адразу пачынаеце здымаць. Новая каманда таксама прыняла Арцёма адразу. Калегі могуць нешта і падказаць, а бывае, і слушную заўвагу выказаць. **Кіраўнік праекта «Уключайся!» Ганна КВІЛОРЫЯ** адзначае, што з моманту знаёмства з Арцёмам уся каманда стваральнікаў праграмы адчувае, нібы ён заўсёды быў з імі: «У нас з'явіўся новы чалавек. Гэта ўжо правераны эфірам нашага медыяхолдынга прафесіянал, што дае нам пэўную гарантыю якасці. Мы паглядзелі некалькі эфіраў з Арцёмам і бачым, што нашы спадзяванні апраўдаліся. Нам важна было знайсці чалавека, які не проста сядзе ў кадр і скажа нешта, напісанае для яго, а будзе сапраўдным журналістам... Тут усё супала. Усе ў камандзе адчуваюць, нібы Арцём заўсёды быў сярод нас».

— Канструктыўная крытыка — гэта заўсёды добра, паколькі дае магчымасць рабіць высновы пра сваю работу не толькі па ўласных назіраннях. Погляд і меркаванне збоку дазваляюць убачыць сябе з іншага ракурсу, — дзеліцца вядучы. — Вядома, я заўсёды ўзважваю каментарыі і словы на свой адрас, але зваротная сувязь ад іншых вельмі патрэбная, асабліва калі гэта людзі з тваёй сферы.

Арцём адзначае, што для яго ў рабоце самае галоўнае — быць самім сабой, без спробы капіраваць вядомых калег ці надзяваць на сябе маску. А вось уключыцца ў працэс яму дапамагае музыка. Калі ж здараюцца непрадбачальныя сітуацыі, то вядучы ўспамінае словы пра тое, што сапраўдны прафесіяналізм у публічнай прафесіі — гэта ўменне абстрагавацца і сканцэнтравацца незалежна ад абставін, каб зрабіць сваю справу добра.

— Я прыйшоў працаваць на праграму не дзеля публічнасці ці пазнавальнасці. Хоць калі казаць пра радыё, то бывае, што пазнаюць мяне па голасе. Але ў сваёй рабоце я маю істотны плюс, які для мяне заключаецца ў магчымасці займацца па жыцці тым, што мне падабаецца, — кажа Арцём Сямён. — А як казаў Канфуцый, калі знойдзеце сабе справу даспадобы, то не будзеце працаваць ні дня. Для мяне рабіць нешта, атрымліваючы задавальненне, — цяпер самае галоўнае.

А як далей вядучы зарэкамендуе сябе — убачым з часам па водгуках аўдыторыі. Калі ж хочаце пазнаёміцца з асобай гэтага цікавага чалавека, пачынайце будны дзень з праграмай «Уключайся!» на тэлеканале «Беларусь 2».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва праграмы «Уключайся!»**

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** [СЦ], **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 1.05** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.20** Навіны надвор'я.
**10.45, 12.10, 18.35, 19.20 Драма «Айчым» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Святая хлусня» (12+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларуская часіна.
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**00.45** Арэна.
**1.25** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 11.15, 21.05** Тэлебарометр.
**9.05, 19.50** «Зразумець. Прабачыць» (16+).
**10.25** «На тыдзень» (16+).
**11.50** Анімацыйны серыял «Стыч!» (6+)
**12.30** «Выкрадальнікі шкарпэтак» (6+).
**14.05** «Усёй сям'ёй» (6+).
**15.05 Фільм «Пасля нашай эры» (12+).**
**17.00** «Суперлато».
**17.40** « Багіня шопінгу. Экстрэмальны сезон» (16+).
**18.40** «На кручку» (16+).
**21.10** Спортлата 6 з 49 , КЕНА.
**21.15 Серыял «Жаночы доктар-4» (16+).**
**22.20 Серыял «Сышчыца» (16+).**
**0.35** «Экстрасенсы-дэтэктывы» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.20** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 19.40, 22.40** Навіны культуры.
**8.25** «Нацыянальны хіт-парад».
**9.15** «Я хачу гэта ўбачыць» (6+).
**9.45, 17.35** «Апошні дзень» (12+).
**10.20, 13.15, 15.50 «Дзень добры, я ваша цётка!» Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**12.50** «Наперад у мінулае».
**14.45** «Навуканамія» (6+).
**15.15** «Люблю і памятаю».
**18.10** «Я нясу вам дар». Канцэрт.
**20.00** «Сваімі словамі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Дзень камандзіра дывізіі». Маст. фільм (12+).**
**22.55** «Рэвалюцыя 1917-га. Эпоха вялікіх перамен». Дак. фільм (16+).

## Беларусь 5

**7.00** Азбука спорту.
**7.15** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі.
**9.10** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. Агляд.
**9.55** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе.
**12.00** Тэніс. Кубак Федэрацыі.
**16.20** Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Цмокі-Мінск» — «Калеў» (Талін).
**18.10** Спорт-цэнтр.
**18.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**19.20** Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Сібір» (Новасібірск).
**21.50** Фігурнае катанне. Гран-пры.
**23.45** Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 07.30, 8.00, 08.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30, 0.35** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
**10.10** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.20** «Бесталковыя нататкі» (12+).
**13.15 «Мата Хары». Серыял (16+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20, 23.40** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**17.20, 18.20** «На самай справе» (16+).
**18.50** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.10** «Удача ў прыдачу!» (12+)
**21.15** «Прапаганда» (16+).
**21.35 Серыял «Васкрасенскі» (16+).**

## СТБ

**6.00, 6.40, 7.45** «Раніца СТБ».
**6.30** [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**8.40** «Тыдзень».
**10.40, 0.05** «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
**11.40** «Як уладкаваны свет» (16+).
**12.35, 21.00** «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 23.20** «Таямніцы Чапман» (16+).
**14.40, 16.50 «Надзвычайная сітуацыя». Серыял (16+).**
**18.30** «Па сутнасці».
**20.30, 23.15** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45** «Міншчына».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**0.55** «Самая карысная праграма» (16+).
**1.45** «Мінтранс» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Аляксандр Неўскі» (6+).**
**6.40, 10.10 Маст. фільм «Гардэмарыны, наперад!» (12+)**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 4.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**14.10, 18.00** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 16.20** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**17.00** «Міравое пагадненне» (16+).
**19.25** «Гульня ў кіно» (12+).
**20.10** «Слабое звяно» (12+).
**21.10** «Назад у будучыню» (16+).
**22.10 Серыял «Кулінар» (16+).**
**2.05** «Разам».
**3.05** «Свет. Меркаванне» (12+).
**3.20, 4.15** Мір. Спорт (12+).
**3.25** «Культ асобы» (12+).
**3.35** «Еўразія. Культурна» (12+).
**3.40** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**3.50** «Нашы замежнікі» (12+).
**4.20 Маст. фільм «Зялёны фургон» (16+).**

## РТР—Беларусь

**6.05** «Новая раніца».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Тайны Беларусі» (16+).
**12.45** «У людзях».
**13.35** «Плюс-мінус».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**17.15** «60 хвілін»(12+).
**18.30** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**21.05 Серыял «Сёмая сімфонія» (12+).**
**23.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Здароўе» (12+).
**7.00** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**7.40** Будучыня сёння (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.25** Пракурорская праверка (16+).
**9.30, 10.25 Фільм «Чырвоны веласіпед» (12+).**
**11.15 Дэтэктыў «Сляды на вадзе» (16+).**
**13.25** Надзвычайнае здарэнне.
**13.55 Фільм «Даўжок» (16+).**
**16.20, 19.40, 22.40, 23.30** Сёння. Галоўнае.
**16.30** Гісторыі выратавання (12+).
**16.55** «За гранню» (16+).
**17.55** «ДНК» (16+).
**19.55** «Суперстар! Вяртанне» (16+).
**22.45** «НЗ.by».
**23.05, 23.45 Серыял «Жывы» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 14.25, 17.20, 21.05, 0.40** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** Мультпарад. «Зорныя войны. Вайна клонаў» (6+).
**7.30 Серыял «Флэш» (12+).**
**8.55 Серыял «Тэрмінатар. Бітва за будучыню» (16+).**
**10.15 Серыял «Японія» (16+).**
**11.05 Трылер «Смяротная бітва» (16+).**
**12.45 Серыял «Яна напісала забойства» (12+).**
**14.30** Мультпарад. «Бос-малакасос» (6+).
**14.55** «Хачу ў Парыж» (12+).
**15.00 Серыял «Каралеўства» (18+).**
**15.45 Серыял «Чорна-белае каханне» (16+).**
**17.25 Серыял «Тэорыя Вялікага выбуху» (16+).**
**18.05 Камедыя «Мы з розных светаў» (16+).**
**19.10 Серыял «Імператрыца» (16+).**
**20.55** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Трылер «З машыны» (16+).**
**22.55 Серыял «Апавяданне служанкі» (18+).**



## ВТБ

**6.05** «Раніца з гумарам» (16+).
**8.05** «Зала чакання» (16+).
**9.00** М/ф «Пацяшоба» (0+).
**9.25** М/ф «Тры каты» (0+).
**9.50** М/ф «Царэўны» (6+).
**10.20** Поўнаметражны анімацыйны фільм «Паляўнічыя на драконаў» (12+).
**12.00** «Галерэя прыгажосці» (16+).
**12.40** «Селапаляцела» (16+).
**13.35** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**14.15, 1.30** «Проста кухня» (16+).
**14.45** «Рускія не смяюцца» (16+).
**15.50** «Уральскія пельмені» (16+).
**17.25, 20.00** Серыял «Кухня» (16+).
**22.35** «Наш рамонт» (16+).
**23.10** «Велабайкі» (16+).
**23.40** «Кіно ў дэталях» (16+).
**0.35** «Рогаў у справе» (16+).
**2.00** Серыял «Татавы дочкі» (12+).
**3.10** «Даеш моладзь» (16+).
**4.50** «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Вялікія міфы. Адысея». Серыял.
**7.05** «Воўк і сямёра казлянят», «Тры сінія-сінія азёры малінавага колеру...», «Ліса і воўк», «Архангельскія навелы», «Чарадзейны пярсцёнак», «Не люба — не слухай». М/ф.
**8.20** «Дзве сястры». Маст. фільм.
**9.25** «Мы — грамацеі!»
**10.05** «Рымскія канікулы». Маст. фільм.
**12.00, 1.10** Дыялогі аб жывёлах [СЦ].
**12.45** Неўскі каўчэг [СЦ].
**13.15** «Дом вучоных» [СЦ].
**13.45** «Абсалютны слых».
**14.25** «Гульня ў бісер».
**15.10** «Не сышліся характарамі». Маст. фільм.
**16.30** «Карціна свету з Міхаілам Кавальчуком».
**17.10** Да 70-годдзя Стаса Наміна. Лінія жыцця [СЦ].
**18.25** «Без купюр». Дак. фільм [СЦ].
**19.30** Навіны культуры.
**20.10** Спектакль «Яўгеній Анегін» [СЦ].
**23.10** «Кітайскі сіндром». Маст. фільм.
**1.50** Шукальнікі.
**2.35** «Рабаванне па... 2». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** «Да і пасля...» (16+)
**19.45** «Галоўная роля».
**20.05** Адкрытая кніга [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**21.40** «Энігма. Міхаэль Фоле».
**1.50** Канцэрт у Маскоўскім міжнародным Доме музыкі.

## Настальгія

**6.00** «Быў час» (12+).
**7.20, 1.15** Маст. фільм «Кодэкс ганьбы» (18+).
**8.25** Фільм-канцэрт «Смуткавасць не трэба» (12+).
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.00, 14.25, 15.40, 17.00, 18.55, 20.50, 21.40, 23.00, 00.55, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.30, 17.30, 5.30** «Пазт Генадзь Айгі чытае свае вершы» (16+).
**12.00** «Сняем, сябры!» (12+)
**13.15** Маст. фільм «Забіць шакала» (16+).
**18.00** «Яловая субмарына» (16+).
**19.10** Маст. фільм «Пашпарт» (18+).
**0.00** «СеваАлогія» (18+).
**2.20** «У сучасных рытмах» (12+).

## EuroSport 1

**1.00** Снукер. Welsh Open (6+).
**2.30, 6.00, 11.30, 21.00** Горныя лыжы. КМ. Мужчыны (16+).
**3.15, 7.00, 22.00** Скачкі на лыжах з трампліна. КМ. Турнэ 4 трамплінаў (16+).
**4.00, 10.00, 19.05** Снукер. The Players Championship (6+).
**8.00, 8.45** Кузаўныя аўтагонкі. Кубак свету (16+).
**9.30** Тэлечасопіс GolfTV Weekly (6+).
**12.30** Веласпорт-трэк. Ліга чэмпіёнаў (16+).
**14.05** Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
**14.35, 17.15** Велакрос. Superprestige. Жанчыны (16+).
**15.35** Велакрос. ЧЕ Мужчыны (16+).
**15.55** Велакрос. Superprestige. Мужчыны (16+).
**18.00** Тэлечасопіс «Зала славы: Ванкувер-2010» (16+).
**19.00, 20.55, 23.05** Навіны (16+).
**23.10** Тэлечасопіс «Пражэктар спорту» (16+).

## Кінакамедыя

**1.15** «Замуж на два дні» (12+).
**3.40** «Дзень радыё» (16+).
**5.30** «Добры доктар» (16+).
**7.10** «Гэты нямёкі момант» (16+).
**9.00** «Вельмі страшнае кіно-3» (16+).
**10.30** «Выдатніца лёгкіх паводзін» (16+).
**12.10** «Завіснуць у Палм-Спрынгс» (18+).
**13.45** «Ібіца» (16+).
**15.20** «Горка» (16+).
**17.15** «Нявеста, якая ўцякла» (16+).
**19.30** «Горка!-2» (16+).
**21.15** «Акей, Лексі!» (18+)
**22.50** «Кароль вечаранак-2» (16+).

## ТБ3

**6.00** Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
**8.00** «Вой, ма-мач-кі!»
**9.00** «Ганна-дэтэктыў» (16+).
**9.55** «Улегцы» (12+).
**10.30** «Вялікая маленькая хлусня». Серыял (16+).
**12.10** «Знакі лёсу» (16+).
**12.50, 18.00** «Сляпая» (16+).
**14.00, 19.10, 3.35** «Вараж бітка» (16+).
**15.10** «Старац» (16+).
**15.50, 2.45** «Містычныя гісторыі» (16+).
**16.55** «Пятая варта». Серыял (16+).
**20.20** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**23.05** «Праклятыя зоркі». Дак. фільм (16+).
**0.00** «10 самых» (16+).
**0.40** «Прыцемкі» (16+).
**4.30** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).

## ТБ1000

**5.30, 17.15, 18.05** Доктар Хаус (18+).
**6.20** Чалавек-Павук (12+).
**8.30** Чалавек-Павук-2 (12+).
**10.55** Чалавек-Павук-3 (12+).
**13.30** Чарапашкі-ніндзя (16+).
**15.15** Чарапашкі-ніндзя 2 (16+).
**19.00** Дзіяна: гісторыя кахання (12+).
**21.05** Прынцэса Манака (16+).
**22.55** Шакалад (16+).
**0.30** Двое: я і мой цень (16+).
**2.10** Пастка для бацькоў (6+).
**4.15** Кепскія дзяўчынкі (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**6.15** Код апакаліпсіса (16+).
**8.10** Глухар у кіно (16+).
**9.55** Гадзіна пік (16+).
**12.00** Географ глобус прапіў (16+).
**14.10** Выкрутасы (12+).
**16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Чырвоная каралева (16+).
**20.00** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**21.30** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
**23.05** Прабабуля лёгкіх паводзін. Пачатак (16+).
**0.55** Крывавая лэдзі Баторы (16+).
**2.35** Яга. Кашмар цёмнага лесу (16+).
**4.00** Юлечка (16+).

## National Geographic

**6.00, 6.20** Навуковыя глупствы (16+).
**6.40** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**7.35** Інстынкт выжывання (16+).
**8.25** Ледзяная дарога (16+).
**9.15** Непакорны востраў (16+).
**10.05, 10.55, 17.40** Аўта-SOS (16+).
**11.50, 12.40, 16.50** Дзікі тунец. Сезон 9. Серыя 9
«Вернемся да справы» (16+).
**13.25** Даследчык 2.0 (16+).
**14.15** Атлас праклятых месцаў (16+).
**15.10** Наркавойны (16+).
**15.55, 21.50** Злавіць кантрабандыста (16+).
**18.30, 18.50** Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
**19.15, 20.05, 2.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**21.00, 3.40** Дзіўны аэрапорт Нью-Ёрка (16+).
**22.40** Надыходзіць шторм (16+).
**23.35** Уваравнне на Зямлю (16+).
**0.25** У дзікай прыродзе з Беарам Грылсам (16+).
**1.15** Мяжа (16+).
**2.05** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха (16+).
**4.25** Асушыць акіян (16+).
**5.15, 5.35** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00, 10.15, 10.40, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 21.15, 21.40, 7.35** Як гэта ўладкавана? (12+)
**8.25, 11.10, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**9.20, 9.45, 20.20, 20.45** Паляўнічыя на склады (16+).
**12.05** Голыя і напалоханыя (16+).
**16.10** Прыгожа жыць (12+).
**17.35** Эд Стафард: гульня на вылет (16+).
**18.30, 18.55** Кафэ, закусачныя і забягалаўкі: незвычайная дамашняя ежа (12+).
**19.25, 4.27** Хуткія і гучныя (16+).
**23.05, 0.55, 5.14, 6.48** Залатая ліхаманка (16+).
**1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04** Бітва за нерухомасць (12+).

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*
*[СЦ] – фільм трансліюецца са скрытымі субцітрамі.*

ЗЯЛЁНЫ ШУМ

# КАБ ГОРАД БЫЎ, ЯК САД

## Любая кампанія па добраўпарадкаванні ў Брэсце вызначаецца маштабнай пасадкай дрэў

**ТОЕ, што ў самым заходнім абласным цэнтры краіны за апошнія гады на парадак больш стала зялёных насаджэнняў, факт. Брэст шмат будаваўся апошнім часам, былі знесены дрэвы, якія аказаліся на будаўнічых пляцоўках. Нярэдка гэта выклікала нараканні гараджан. Але цяпер, акрамя кампенсацыйных пасадак, інтэнсіўна вядзецца азеляненне па ўсіх раёнах горада. Вось і сёлетні асенні месячнік па добраўпарадкаванні пачаўся з акцый па пасадцы дрэў.**

Можна сказаць, аднымі з першых у гэтай пачэснай справе «засвяціліся» актывісты Маскоўскай раённай арганізацыі БРСМ. Маладыя людзі залажылі Алею сямейных дрэў у мікрараёне ПЗМР-5 — гэта зусім новы мікрараён, дзе большасць навасёлаў складаюць маладыя сем'і. Былі пасаджаны дубкі, ліпы, клёны. Удзельнікі экалагічнай акцыі паабяцалі даглядаць дрэўцы; вядома, і камунальныя службы не пакінуць без увагі новую алею.

А ў мінулую суботу пад эгідай гарвыканкама прайшла маштабная акцыя па добраўпарадкаванні. Падрабязнасці ад працоўных дэсантаў прывёў у тэлеграм-канале **старшыня гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК**. На суботнік выйшлі супрацоўнікі абедзвюх гарадскіх адміністрацый і апарат гарвыканкама, а таксама прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый горада — усяго каля сямі тысяч чалавек. Было прыведзена ў парадак мноства розных аб'ектаў, у тым ліку новы рэсурсны цэнтр для дзяцей з аўтызмам, сквер па вуліцы Папаніна, тэрыторыя Гарадскога саду, пляцоўка, якая прымыкае да медыцынскага цэнтра, што ўзводзіцца па вуліцы Маслава. Члены працоўных дэсантаў прыбіралі лісце, ачышчалі тэрыторыі ад хмызняку і ламачча. І галоўнае — былі пасаджаны сотні дрэў і кустоў, якія ўпрыгожаць вуліцы і двары, зашумяць вясной зялёнай лістотай, напоўняць гарадское паветра кіслародам.



Маладыя дрэвы пры пасадцы ўмацоўваюць цяпер кійкамі зялёнага колеру. «Гэта такая «фішка» нашага горада, намёк на «зялёную сталіцу» краіны», — падкрэслілі на прадпрыемстве «Камунальнік», якое праводзіць асноўныя работы па азеляненні.

— І новыя, і кампенсацыйныя пасадкі ажыццяўляюцца па плане азелянення горада, — сказала **начальнік сектара ландшафтнай архітэктуры ў КУП «Камунальнік» Вікторыя НОВІК**. — На вуліцах горада пераважаюць ліставыя пароды, але тут можна сустрэць таксама елку, сасну, тую заходнюю. Пры выбары дрэў улічваецца ўстойлівасць да загазаванасці і тое, як дрэвы ўпішуцца ў гарадскі пейзаж. Пры фарміраванні кампазіцый бярэцца да ўвагі, як дрэвы спалучаюцца, каб адны не сталі непажаданымі суседзямі для іншых.

Цяпер актыўна вядуцца асеннія пасадкі, а толькі сёлетняй вясной было пасаджана каля 6500 дрэў. «Лідарамі» сярод саджанцаў сталі ліпа і клён, шмат пасаджана ясеня, бярозы.

У новых мікрараёнах, якія ўзводзяцца, як правіла, на пяску, дрэвы не вельмі добра прыжываюцца, таму спецыялісты раяць садзіць там сосны, елкі. Даволі часта дрэвы высаджваюцца алеямі. Дарэчы, акрамя традыцыйных парод дрэў, у складзе новых пасадак сустракаюцца даволі экзатычныя расліны. Напрыклад, супрацоўнікі «Камунальніка» на вуліцах Наганава і Горкага высадзілі больш за 100 архангельскіх ліп, а на Грунвальдскай — больш за 250 кустоў пірэі вербалістай. У раёне санаторнай школы-інтэрната і дзіцяча-юнацкай школы па футболе з'явіліся ядловец казацкі і туі заходнія. А на вуліцах Машэрава, Зубачова, Гогаля хутка зашумяць лістотай маладыя ліпы, а яшчэ клёны, каштаны і любімыя ўсімі бярозы. Усё для таго, каб гарадское асяроддзе станавілася больш экалагічным і прывабным.

Паводле інфармацыі гарвыканкама, усяго ў асенні перыяд у Брэсце плануецца высадзіць каля 12 тысяч саджанцаў дрэў і кустоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з тэлеграм-канала Аляксандра РАГАЧУКА.**

# ЧЫСЦІНЯ НАВОКАЛ — СПРАВА АГУЛЬНАЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Гэта тэма атрымала развіццё падчас нядаўняй сустрэчы спікера верхняй палаты парламента Наталляй Качанавай з прадстаўнікамі мясцовых улад сталіцы, на якой былі ўсебакова абмеркаваны пытанні яе далейшага добраўпарадкавання. На думку Андрэя Бугрова, тая грунтоўная размова ў значнай ступені стымулявала ўлады Мінска ўнесці істотныя змены ў планы па добраўпарадкаванні сталіцы.



> Мінчанам ёсць чым ганарыцца ў справе навядзення парадку ў горадзе. Дастаткова прыгадаць станоўчы досвед рэалізацыі праекта «Зялёны двор разам!»

Нагадаем, яшчэ на вясенняй сесіі гарсавета быў зацверджаны план дзеянняў на бягучы год па навядзенні парадку на тэрыторыі горада. Аднак жыццё ўнесла карэктывы. З цягам часу высветлілася, што ў дакуменце не атрымалася ахапіць вырашэнне ўсіх праблемных пытанняў па добраўпарадкаванні і азеляненні. А такія пытанні паўсталі гэтай восенню. Адказам на іх стаў праект рашэння Мінгарвыканкама «Аб добраўпарадкаванні г. Мінска». Мэты па-ранейшаму тыя ж, а вось падыходы новыя.

У час падрыхтоўкі праекта дакумента ўлічваецца самы розны спектр меркаванняў і прапаноў, у тым ліку жыхароў мікрараёнаў, дэпутатаў, прадстаўнікоў гарадскіх арганізацый і службаў, раённых адміністрацый. Што прапануецца? Напрыклад, новыя падыходы ў знешнім архітэктурным афармленні канкрэтных вуліц і азеляненні сталіцы ўвогуле, больш актыўнае прыцягненне да ўдзелу ў гэтай рабоце таленавітых студэнтаў тэхнічных ВНУ, адкрыццё дадатковых зон адпачынку гараджан, распрацоўка новых падыходаў па сучасным вячэрнім асвятленні будынкаў, удасканаленні сістэмы святочнай ілюмінацыі і г. д. Карацей, усё тое, што будзе садзейнічаць стварэнню прывабнага выгляду сталіцы.

— Рэалізацыя гэтага дакумента ў поўным аб'ёме дапаможа мясцовым уладам выйсці на новы, больш высокі ўзровень добраўпарадкавання Мінска, — упэўнены суразмоўнік.



Дзеля справядлівасці адзначым, што мінчанам ёсць чым ганарыцца ў справе навядзення парадку ў горадзе. Дастаткова прыгадаць станоўчы досвед рэалізацыі праекта «Зялёны двор разам!». Яго задача — азеляненне прастораў каля шматкватэрных жылых дамоў з удзелам іх жыхароў. У выніку сёлета было абноўлена амаль 800 дваровых тэрыторый сталіцы. Толькі апошнім часам высаджана каля 36 тысяч дрэў і 122 тысяч кустоў, змайстраваны сотні кветкавых кампазіцый. Датэрмінова перавыкананы гадавы план па рамонце дарожнага пакрыцця вуліц і дваровых праездаў. Адрамантавана прыкладна паўтары тысячы фасадаў дамоў. І такіх прыкладаў вельмі шмат.

У гэтых здабытках ёсць немалы ўнёсак і дэпутатаў Мінскага гарадскога Савета. Сёння яны імкнуцца не толькі асабістым прыкладам матываваць выбаршчыкаў удзельнічаць у суботніках, але і пастаянна працуюць у сваіх выбарчых акругах з кіраўнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў, пераконваюць іх фінансава садзейнічаць упрыгожванню навакольных тэрыторый.

> Яшчэ на вясенняй сесіі гарсавета быў зацверджаны план дзеянняў на бягучы год па навядзенні парадку на тэрыторыі горада. Аднак жыццё ўнесла карэктывы.

Падтрыманне парадку ў велізарным горадзе, яго пастаяннае добраўпарадкаванне — працэс няспынны. Скажам, мала вывезці бытавыя адыходы, смецце, кубаметры апалай лістоты — яе яшчэ трэба правільна ўтылізаваць. Ужо нямала зроблена ў гэтым кірунку. Андрэй Бугроў расказвае пра ўнікальную на постсавецкай прасторы станцыю кампаставання лістоты, дробных галінак дрэў і кустоўя. Там штогод прыкладна 70 тысяч тон гэтай арганічнай субстанцыі ператвараецца ва ўрадлівы кампост з далейшым яго выкарыстаннем у якасці карыснага ўгнаення.

У гарадскіх улад ёсць пэўныя планы па ўзвядзенні за межамі Мінска вытворчага высокатэхналагічнага комплексу па перапрацоўцы гарадскіх адходаў, дзе, акрамя экалагічна бяспечнай утылізацыі, быў бы і эканамічны эфект.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Фота Ірыны СІДАРОК.**

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

# «МЫ ПАМЯЦЦЮ СТАЛІ»

**Мітынг-рэквіем на месцы расстрэлу тысяч людзей адбыўся ва ўрочышчы Стасіна Столінскага раёна. Там адкрылі абноўлены мемарыял.**



На месцы аднаго з найбуйнейшых у нашай краіне пахаванняў мірных жыхароў прайшло жалобнае мерапрыемства. Амаль 80 гадоў таму ахвярамі нацызму тут сталі 12 500 чалавек розных нацыянальнасцяў, розней веры, але з аднолькавым колерам крыві і аднолькавым жаданнем жыць. Сярод іх было шмат дзяцей, жанчын, старых і нямоглых людзей. У брацкіх магілах пахавана 8000 тысяч яўрэяў, 4500 беларусаў, рускіх, украінцаў, з іх — 3548 дзяцей. Самыя масавыя расстрэлы прайшлі ў верасні 1942 года, калі знішчалі Столінскае гета. Тыя расстрэлы даследчыкі гісторыі называюць асабліва зверскімі і бесчалавечнымі. Асуджаных на смерць дзялілі на групы і падгрупы, прымушалі рухацца да месца экзекуцыі па загадзя падрыхтаванай схеме. Тых жа, хто не мог рухацца дастаткова хутка альбо іншым чынам парушаў схему, збівалі да крыві. Людзей укладвалі пластамі — тварам уніз, а малых дзяцей нярэдка падкідвалі ўверх і стараліся пацэліць на ляту дзеля забавы...

Фактычна, усю акупацыю фашысты прадаўжалі знішчаць людзей у стасінскім лесе, аж да самага вызвалення ў 1944 годзе.

Некалі гэтыя маляўнічыя мясціны былі летняй дачай Станіслава Радзівіла. А напярэдадні Вялікай Айчыннай ва ўрочышчы Стасіна было вырашана ўзвесці ваенны аб'ект — аэрадром. Паспелі выкапаць толькі глыбокія катлаваны, як пачалася вайна. І сталі гэтыя катлаваны брацкай магілай.

У 1969 годзе на месцы трагедыі быў усталяваны абеліск, у 1992 годзе ўстаноўлены помнік — скульптурная кампазіцыя ў выглядзе жанчын у смутку. Яшчэ адзін памятны знак у выглядзе разгорнутай кнігі быў дадаткова ўстаноўлены Кіеўскай іудзейскай абшчынай. Пакрысе гэтае месца станавілася галоўным месцам памяці аб вайне на Століншчыне.

З пачатку гэтага года пад эгідай Столінскага райвыканкама былі праведзены маштабныя работы па добраўпарадкаванні месца пахавання і абнаўленні мемарыяла. Каб людзі маглі прыехаць сюды ды ўшанаваць памяць ахвяр, уладкавана аўтастаянка, зроблены дарожкі, разбіты газоны. Таксама зроблена ўваходная арка, устаноўлены інфармацыйныя стэнды. Ад з'езда з аўтадарогі Р88 да павароту на ўрочышча пракладзена асфальтаваная дарога працягласцю 1,372 кіламетра, а па прасецы пракладзена паўкіламетра гравійкі.

Такім чынам, мітынг-рэквіем стаў адкрыццём абноўленага мемарыяла. «Дарогай памяці і смутку», а калі больш дакладна, па сцежцы, па якой некалі вялі на расстрэл мірных жыхароў, прайшло ў чацвер амаль 1500 чалавек. Сярод удзельнікаў мерапрыемства было шмат школьнікаў, яны трымалі ў руках кветкі, у асноўным чырвоныя гваздзікі як сімвал бязвінна пралітай крыві.

Адмысловую тэатралізаваную пастаноўку яе аўтары назвалі «Мы памяццю вашаю сталі». Яна атрымалася вельмі кранальнай. Удзельнікі імпрэзы нібы перажылі тыя страшныя імгненні, калі людзі



рабілі свае апошнія крокі па зямлі. Ад іх імя гучала гаротнае: «Ні бачыць, ні чуць, ні слова сказаць мы не ў стане. Мы каменем сталі... Мы памяццю вашаю сталі...»

Пра тое, як важна захоўваць памяць пра вайну, перадаваць яе наступным пакаленням, гаварыў у сваёй прамове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА.**

— Гэта яшчэ адно знакавае месца ў краіне, куды будуць прыходзіць людзі. Хачу, каб маладое пакаленне памятала і цаніла свабоду, незалежнасць, мірнае жыццё, — сказаў кіраўнік рэгіёна.

**Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігар ЛУЦКІ** падкрэсліў, што такая колькасць людзей на мерапрыемстве сведчыць аб кансалідацыі грамадства, яго адзінстве, аб агульнасці поглядаў на наша мінулае і будучыню.

Да помнікаў ляглі кветкі, вянкі, гірлянды. Прагрымеў вайсковы салют.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

## Абаяльная і паспяховая

### Брэсцкая топ-менеджар увайшла ў спіс Forbes

**Прэмію Forbes за паспяховыя жаночыя праекты ў Беларусі ўручалі ўпершыню. Forbes выбраў 30 самых паспяховых жаночых праектаў за час пандэміі. Удзельніц выбіралі не па велічыні маёмасці, а за найлепшыя бізнес- і сацыяльныя праекты.**
**У топ-30 увайшла намеснік дырэктара па маркетынгу кампаніі «Санта Брэмар» Алеся ЕЛІНА.**



Фота кампаніі «Санта-Брэмар».

На ўключэнне ў рэйтынг конкурсу ўплывалі кейсы — эфектыўныя рашэнні для развіцця бізнесу, рэалізаваныя ў 2020 і 2021 гадах. Да ўвагі браўся таксама ўдзел у дабрачынных мерапрыемствах.

Алеся ўвайшла ў рэйтынг за рэдызайн гандлёвай маркі «Маціяс». Для павелічэння рэйтынгу брэнда на рынку правялі рэстайлінг і комплексную рэкламную кампанію, вынікам яе стала павелічэнне долі рынку да 47 працэнтаў.

Алеся адзначае, што пачэсна быць у ліку самых паспяховых жанчын свету:

— Узнагароду разглядаю як ацэнку работы ўсёй нашай каманды. Нам удалося не толькі правесці рэдызайн гандлёвай маркі, але і павысіць продажы, пашырыць аўдыторыю.

Алеся Еліна ў кампаніі працуе 20 гадоў. Пераехала ў Брэст з Запаляр'я, мае дыпломы трох ВНУ. Пачынала спецыялістам і дарасла да намесніка дырэктара па маркетынгу. Пад яе кіраўніцтвам у кампаніі распрацоўваюць новыя гандлёвыя маркі і выводзяць на рынак прадукты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Больш грошай у «кішэню» вобласці

**Дэпутатамі абласнога Савета Прыдзвіння зацверджана павелічэнне даходнай часткі бюджэту на суму каля 45 мільёнаў рублёў. Гэта сведчыць, што эканоміка Віцебшчыны развіваецца стабільна. Пераважная заслуга ў тым, што паступленняў становіцца больш, — рэальнага сектара.**

**Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ** падчас сесіі ўдакладніў, што дадатковыя грошы накіруюць у асноўным на падтрымку аграрыяў, медыкаў, а таксама на вырашэнне найбольш праблемных пытанняў на іншых вектарах.

Для параўнання: у першым паўгоддзі з кансалідаванага бюджэту вобласці прафінансавалі расходы ў аб'ёме 1 456,1 мільёна рублёў — амаль 55 % планавых гадавых прызначэнняў. У структуры расходаў на фінансаванне дзяржаўных праграм і мерапрыемстваў накіравана 78 % ад агульнага аб'ёму расходаў. Асноўная частка бюджэтных сродкаў, або 68 % забяспечвае ўтрыманне сацыяльна-культурнай сферы. Таму павелічэнне паступленняў у бюджэт датычыцца практычна ўсіх жыхароў вобласці.

На сесіі агучвалася нямала іншых лічбаў па бюджэтнай тэме.

**Начальнік галоўнага фінансавага ўпраўлення Віцебскага аблвыканкама Генадзь ГРАБНЁЎ**, пералічваючы крыніцы паступлення грошай, нагадаў пра новую: з пачатку жніўня спаганяецца мясцовы збор за перасячэнне на транспарце мяжы з краінамі Еўрапейскага саюза. Віцебшчына — суседка Літвы і Латвіі, пры гэтым мяжуе з Расійскай Федэрацыяй. У ЕС адсюль можна трапіць праз сем пунктаў пропуску, якія знаходзяцца на тэрыторыі Пастаўскага, Верхнядзвінскага і Браслаўскага раёнаў. Паводле інфармацыі, на пачатак кастрычніка ўжо спагнана каля 65 тысяч рублёў, а да канца года гэтая сума можа перавысіць 100 тысяч рублёў. Грошы накіроўваюцца на патрэбы абласной сістэмы аховы здароўя.

Распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі ў вобласці і ўвядзенне абмежавальных мер на правядзенне масавых мерапрыемстваў паўплывала на аб'ём атрыманых сродкаў ад аказання платных паслуг. Значныя страты даходаў ад ажыццяўлення названай дзейнасці адзначаліся летась. А сёлета ў першым паўгоддзі аб'ём даходаў ад пазабюджэтнай дзейнасці павялічыўся больш чым у 1,3 раза да аналагічнага перыяду мінулага года, аднак не дасягнуў узроўню 2019 года. Гэта абумоўлена неспрыяльнай эпідэміялагічнай сітуацыяй, звязанай з распаўсюджваннем пандэміі COVID-19.

У студзені — чэрвені бюджэтнымі ўстановамі Віцебскай вобласці атрымана 47,4 мільёна рублёў ад дзейнасці, што прыносіць даходы, — 4,9 % ад бюджэтнага фінансавання адпаведных галін сацыяльнай сферы (у 2019 годзе — 6,5 %).

Як і ў папярэднія гады, у бюджэце вобласці захоўваецца значны ўзровень запазычанасці па сродках, выдзеленых з бюджэту на зваротнай аснове. У галоўным фінансавым упраўленні аблвыканкама лічаць, што меры, якія прымаюцца па аднаўленні і спагнанні сродкаў, выдзеленых такім чынам, недастатковыя.

Адзін са шляхоў больш рацыянальнага выкарыстоўвання дзяржаўных грошай — аптымізацыя сеткі бюджэтных арганізацый. Адпаведнае рашэнне абласны Савет прыняў у снежні мінулага года. У першым паўгоддзі ў выніку рэалізацыі адпаведных мер толькі ў галіне культуры за кошт скарачэння штатных адзінак эканомія склала больш чым 70 тысяч рублёў. А ў сферы адукацыі асноўная работа па аптымізацыі ўстаноў завершана да пачатку чарговага вучэбнага года. У прыватнасці, зачынены 15 устаноў дашкольнай адукацыі, 12 школ, рэарганізавана 22 установы, скарочана 400 штатных адзінак. Разліковая эканомія бюджэтных сродкаў складзе больш за 1 мільён рублёў.

Ва ўмовах абмежаванасці бюджэтных сродкаў беларускім урадам ставіцца задача павысіць выніковасць работы цэнтраў па забеспячэнні дзейнасці бюджэтных арганізацый, аптымізаваць іх функцыянаванне і колькасць работнікаў. У Віцебскай вобласці функцыянуе 32 цэнтры, у тым ліку 23 міжгаліновыя і 9 галіновых, якімі ажыццяўляецца абслугоўванне каля 1400 бюджэтных арганізацый.

А дэпутаты на месцах павінны пільна сачыць за сітуацыяй, каб не было бяздумных скарачэнняў, аптымізацыі дзеля самой аптымізацыі. Галоўнае, каб усё было зроблена як у той прыказцы: сем разоў адмерай...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю Аксаны Алегаўны АГАРОДНІКАВАЙ, старшыні Горацкага раённага Савета дэпутатаў, і выказваюць глыбокія спачуванні яе родным і блізкім.**


МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

**www.zviazda.by**

**e-mail: info@zviazda.by**

**(для зваротаў):** zvarot@zviazda.by

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 311 17 35;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.**

**Тыраж 14.804.** **Нумар падпісаны ў 19.30 4 лістапада 2021 года.**

# Адкуль на Палессі барханы?

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Эколагі сёння гавораць аб глабальнай змене клімату, аб павелічэнні сярэдняй гадавой тэмпературы, што выклікае раставанне леднікоў, павышэнне ўзроўню Сусветнага акіяна. Акрамя пацяплення, адбываецца таксама разбалансіроўка ўсіх прыродных сістэм, якая прыводзіць да змены рэжыму выпадзення ападкаў, тэмпературных анамалій і павелічэння частаты экстрэмальных з'яў, такіх як ураганы, паводкі і засухі.

Змяненне клімату Беларусі і яго прычыны — тэма, даследаваннем якой займаюцца апошнім часам вельмі сур'ёзна. Існуе шмат прычын, па якіх надвор'е перажывае змены. Асаблівасці клімату Беларусі ў гэты перыяд уключаюць змяненне параметраў зямной арбіты, парніковы эфект, антрапагенныя прычыны, якія ўяўляюць сабой розныя віды дзейнасці чалавека, што цягнуць змены навакольнага асяроддзя. Працэс глабальнага пацяплення ўсё больш і больш набірае абароты. Спыніць яго ўжо нерэальна. Ён уздзейнічае на сельскую гаспадарку, флору, фаўну і само здароўе.

***— Сяргей Аляксандравіч, што адбываецца са змяненнем клімату ў Беларусі і з чым гэта звязана?***

— Апошнія чатыры-пяць дзесяцігоддзяў адзначаны беспрэцэдэнтна высокімі тэмпамі пацяплення на ўсім зямным шары. Сярэднегадавая глабальная тэмпература расце практычна беспярыпынна з другой паловы 1970-х гадоў з сярэдняй хуткасцю каля 0,019 °C у год. Паводле высновы Міжурадавай групы экспертаў па змене клімату (МГЭЗК) ААН, галоўнай прычынай назіранага глабальнага пацяплення з'яўляецца беспярыпынны рост утрымання вуглякіслага газу ў атмасферы. Сапраўды, паводле даных інструментальных назіранняў, канцэнтрацыя вуглякіслага газу ў атмасферы за апошнія 60 гадоў, з 1960 да 2020, павялічылася з 316 да 415 ppm, што прывяло да парніковага эфекту каля 1,5 Вата на квадратны метр зямной паверхні (дысбалансу паміж энергіяй, якая да нас прыходзіць ад сонца, і энергіяй, якая адбіваецца назад, у касмічную прастору). Гэтага парніковага эфекту цалкам дастаткова, каб растлумачыць цяперашняе павышэнне тэмпературы зямнога шара.

Аднак у розных рэгіёнах пацяпленне адбываецца па-рознаму. Так, **у Беларусі сярэднегадавая тэмпература паветра ў апошнія дзесяцігоддзі павышаецца з хуткасцю каля 0,06 °С у год, што прыкладна ўтрая перавышае сярэднюю па планеце хуткасць пацяплення**. Рост зімовай тэмпературы з 1960 да 2020 года склаў, па розных ацэнках, ад 3,8 да 4,2 °С, а рост летняй тэмпературы — ад 2,2 да 2,5 °С.

Аднак сістэматычны рост тэмпературы — толькі адзін бок глабальнага пацяплення. Значна большую пагрозу для чалавецтва ўяўляе выкліканае глабальным пацяпленнем павелічэнне верагоднасці ўзнікнення экстрэмальных з'яў надвор'я, такіх як ураганы, засухі, хвалі цяпла, ліўневыя ападкі і інш. Усё гэта з'яўляецца натуральным вынікам павышэння тэмпературы атмасферы і акіяна, што прыводзіць да змены глабальнага гідралагічнага цыкла, павелічэння сумарнага выпарэння і ўтрымання вадзяной пары ў атмасферы. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што антрапагенная дзейнасць вывела кліматычную сістэму з раўнавагі, а «разбалансаваныя» натуральныя механізмы сістэмы прывялі да таго, што мы маем цяпер.

***— З якога часу ў Беларусі назіраецца змяненне клімату?***

— У нас пацяпленне пачалося з канца 1980-х гадоў у форме рэзкага (скачкападобнага) павышэння зімовай тэмпературы. Пацяпленне ў нашай краіне пачалося са спазненнем на 10—15 гадоў ад астатніх мацерыковых раёнаў, што, верагодна, было звязана з астуджальным уплывам Паўночнай Атлантыкі, якая знаходзілася з пачатку 1960-х да канца 1990-х гадоў у адмоўнай (халоднай) фазе свайго натуральнага 60-гадовага цыкла.

***— Чым характарызаваўся клімат Беларусі мінулых стагоддзяў?***

— Гісторыя метэаралагічных назіранняў у Беларусі налічвае больш за 200 гадоў, і на працягу гэтага часу клімат мяняўся нераўнамерна. 100 гадоў таму ў нашай краіне таксама адбывалася пацяпленне клімату, але яго характар быў іншы: сярэднія тэмпературы тады былі некалькі ніжэйшыя за назіраныя цяпер, аднак сярэднегадавая колькасць ападкаў пры гэтым была высокая.

На многіх метэастанцыях, адкрытых да Вялікай Айчыннай вайны, рэкорды па гадавой колькасці ападкаў, пастаўленыя ў тыя гады, трымаюцца да гэтага часу. Пачынаючы з 1940-х гадоў пацяпленне змянілася пахаладаннем і зніжэннем колькасці ападкаў, якое дасягнула найбольшай сілы на мяжы 1960-х і 1970-х гадоў. Гэта пахаладанне звязваюць з павелічэннем запыленасці атмасферы з-за вулканічных выбухаў і больш высокай актыўнасцю Ла-Ніньі (Эль-Ніньа і Ла-Ніньа — дзве фазы адной з'явы, сутнасць якой заключаецца ў змене цыркуляцыі вод у трапічнай зоне Ціхага акіяна; гэта аказвае істотны ўплыў на велічыню вадзяной пары, якая паступае ў атмасферу, і пры ўзмацненні Ла-Ніньі аб'ёмы гэтых паступленняў зніжаюцца). Пацяпленне, тое, што адбываецца ў цяперашні час, характарызуецца моцным павышэннем тэмпературы пры нязначным павелічэнні колькасці ападкаў ці ж яго адсутнасці. Такім чынам, клімат Беларусі становіцца больш засушлівым.

***— Якія ў сувязі з гэтым назіраюцца змены агракліматычных абласцей у нас?***

— Агракліматычныя зоны Беларусі за мінулы перыяд глабальнага пацяплення зведалі значныя змены. Гадавая сума актыўных сярэднясутачных тэмператур вышэй за 10 °С узрасла больш чым на 20 %. Сярэдняя хуткасць прасоўвання ў паўночным напрамку ізаліній гадавой сумы актыўных тэмператур для апошніх трох дзесяцігоддзяў склала каля 12 км у год. Сярэдняя працягласць вегетацыйнага перыяду, якая вызначаецца па датах устойлівага пераходу сярэднясутачнай тэмпературы вясной і восенню праз +5 °С, у апошнія 20 гадоў склала 159 дзён на поўначы і 179 дзён на поўдні Беларусі, тады як у базавы кліматычны перыяд 1961—1990 гг. яе дыяпазон быў 149—165 дзён.

Зоны залішняга ўвільгатнення з гідратэрмічным каэфіцыентам больш чым 1,5 цалкам зніклі з карты Беларусі, хоць да пачатку пацяплення да гэтых зон адносілася большая частка Віцебскай вобласці і некаторыя тэрыторыі Гродзенскай і Мінскай абласцей. **На паўднёвым усходзе Гомельскай вобласці і паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці пачынаюць фарміравацца зоны з гідратэрмічным каэфіцыентам блізкім да адзінкі, што адпавядае мяжы стэпавай зоны**. Сярэдняе для Беларусі значэнне індэкса арыднасці, які вызначаецца як суадносіны гадавой сумы ападкаў да патэнцыйнай выпаральнасці, з 1979 да 2020 года зменшылася на 30 % і складае прыкладна 0,8, што адпавядае перавышэнню патэнцыйнага выпарэння над ападкамі на 20 %. Сёння гадавая выпаральнасць пераважае над ападкамі практычна на ўсёй тэрыторыі Брэсцкай і Гомельскай абласцей.

***— Што адбываецца з іншымі кліматычнымі характарыстыкамі?***

— Сярэдняя працягласць зімовых адліг у 2000-я гады перавысіла кліматычную норму больш чым на восем дзён, а іх сумарная працягласць з 1960 да 2019 года павялічылася на 17 дзён і цяпер складае прыкладна 34 дні. Па прагнозах кліматычных мадэляў, агульная працягласць безмарознага перыяду да 2050 года можа павялічыцца яшчэ больш чым на 20 дзён.

Істотна пачасціліся і ўзмацніліся хвалі цяпла. Да пачатку цяперашняга пацяплення хвалі цяпла на тэрыторыі Беларусі ўзнікалі ў сярэднім адзін раз на тры гады, а цяпер — не радзей за адзін раз на два гады, а на поўдні Беларусі — і па некалькі разоў на год.

У летні сезон адзначаецца скарачэнне працягласці выпадзення ападкаў на ўсёй тэрыторыі краіны на 20 % і адначасова павелічэнне максімальных сум ападкаў на 20—30 % з найбольшым ростам у паўднёвых раёнах, і павелічэнне паўторнасці засух розных градацый ад 3 да 26 % на большасці метэаралагічных станцый. Згодна з разлікамі кліматычных мадэляў, чакаецца павелічэнне гадавых і сезонных сум ападкаў з найбольшым ростам у зімовы перыяд. **Павелічэнне ападкаў будзе абумоўлена выпадзеннем дажджоў і снягоў высокай інтэнсіўнасці на працягу ўсяго года, але таксама чакаецца павелічэнне працягласці засушлівых перыядаў у летне-восеньскі сезон**, што сведчыць аб далейшым узмацненні экстрэмальнасці клімату.




**Карты гадавых сум актыўных тэмператур (вышэй за 10 °С) для двух перыядаў: 1961—1990 гг. (злева) і 1991—2019 гг.**



**Барханы на Палессі.**

***— Якіх наступстваў чакаць нам у сувязі з такім змяненнем клімату?***

— Праекцыі будучых змяненняў клімату Беларусі на аснове глабальных лічбавых мадэляў паказваюць на прадаўжэнне назіраных кліматычных змяненняў. У будучыні яшчэ больш можа ўзмацніцца працэс арыдызацыі, ці памяншэнні ступені ўвільгатнення тэрыторый, які выклікае скарачэнне біялагічнай прадукцыйнасці экасістэм, клімату Беларусі, які суправаджаецца інтэнсіўным пацяпленнем і паніжэннем гадавой сумы эфектыўных ападкаў (за вылікам выпарэння). Ад чаканых намі змен клімату могуць выйграць толькі экасістэмы на поўначы Беларусі — яны пакуль яшчэ не забяспечаны празмернай колькасцю цяпла. Аднак на поўдні краіны прагназаванае хуткае пацяпленне і памяншэнне летніх ападкаў павысіць рызыку засух і, вядома, не будзе спрыяць росту прадукцыйнасці мясцовых экасістэм. Адбудзецца парушэнне экалагічнай раўнавагі экасістэм і выцясненне адных біялагічных відаў іншымі: многія барэальныя віды раслін (віды раслін, якія распаўсюджаныя ў хвойных лясах умеранай зоны Паўночнага паўшар'я) знікнуць або скароцяць арэал свайго пражывання, а ім на змену прыйдуць новыя расліны з лесастэпавай і стэпавай зон.

***— Ужо не сакрэт, што наша Палессе зарастае барханамі. Чаму так адбываецца і ці можна з гэтым змагацца?***

— Прычыны гэтага звязаны не толькі са змяненнем клімату. Гэты рэгіён у 1960—1970-я гады падвергнуўся маштабнай асушальнай меліярацыі. Асушэнне тарфяна-балотных глеб і іх інтэнсіўнае сельскагаспадарчае выкарыстанне карэнным чынам змянілі водны баланс і фізічныя ўласцівасці падсцілальнай паверхні. Асушэнне балот прывяло да зніжэння ўзроўню грунтавых вод, перасыхання ручаёў і малых рэк, а гэта істотным чынам адбілася на водным рэжыме ўсяго рэгіёна. У выніку змены альбеда і цеплафізічных уласцівасцяў меліяраваных глеб павялічылася амплітуда сутачнага ходу тэмпературы, павысілася частата засух і замаразкаў, запаволіўся прагрэў ворнага пласта вясной.

Цяпер Палессе адносіцца да зоны з празмернымі рэсурсамі цяпла і сонечнай радыяцыі, але затое не хапае рэсурсаў вільгаці для мясцовых раслінных супольнасцяў. Даныя спадарожнікавых назіранняў паказваюць, што адчувальнасць біяпрадукцыйнасці экасістэм да зменлівасці клімату ў гэтым рэгіёне ў 2-3 разы вышэйшая, чым у астатняй частцы Усходняй Еўропы. **Сярэдняя дзённая тэмпература глебы летам у Палессі расце амаль у тры разы хутчэй, чым у сярэднім па Беларусі**. Сярэдняя амплітуда сутачнага ходу тэмпературы падсцільнай паверхні, у адрозненне ад астатняй часткі Беларусі, па меры пацяплення не змяншаецца, а павялічваецца, асабліва для зямель сельскагаспадарчага прызначэння. Найбольш уразлівымі з'яўляюцца вільгацелюбівыя шыракалістыя драўняныя пароды, якія з-за высокага непрадукцыйнага скідвання вады з паверхні палёў і нізкага ўзроўню грунтавых вод на меліяраваных тэрыторыях сёння біялагічна слабеюць і становяцца нядзольнымі супрацьстаяць засухам, якія становіцца ўсё больш і больш.

Змагацца з глабальным пацяпленнем і яго рэгіянальнымі праявамі можна толькі пры кансалідаванай пазіцыі ўсіх краін па пытанні зніжэння выкідаў парніковых газаў. Для дасягнення мэт Парыжскага пагаднення — утрымаць глабальнае пацяпленне на адзнацы ў паўтара–два градусы — спатрэбяцца хуткія і маштабныя змены ва ўсіх аспектах жыцця грамадства: **неабходна цалкам рэфармаваць энергетычную сістэму, кардынальна перагледзець прынцыпы землекарыстання, сельскай гаспадаркі, горадабудаўніцтва і прамысловасці ў цэлым**. Паводле разлікаў эканамістаў, рэалізацыя гэтых мер абыдзецца прыкладна ў 2,5 % ад сукупнага сусветнага ВУП, або — у абсалютным выражэнні — па 2,4 трлн долараў штогод на працягу 20 гадоў.

Што можам зрабіць мы? У ліку найбольш эканамічных і эфектыўных мер змякчэння наступстваў глабальнага пацяплення для Беларусі ў першую чаргу варта адзначыць: павелічэнне лясістасці тэрыторыі, паўторнае забалочванне раней асушаных і парушаных торфараспрацоўкамі балот, укараненне адаптыўных інавацый у лясной гаспадарцы, стварэнне мэтавых плантацый хуткарослых драўняных раслін. Рэалізацыя гэтых мер дасць магчымасць запаволіць дэградацыю глеб і палепшыць водазабеспячэнне паўднёвых рэгіёнаў Беларусі. Разлікі складнікаў унутранага вільгацезвароту для тэрыторыі Беларусі паказваюць, што змяненне мясцовага выпарэння ў выніку павелічэння лясістасці і паўторнага забалочвання выпрацаваных тарфяных радовішчаў здольнае на 10 % павялічыць колькасць ападкаў у вегетацыйны перыяд і тым самым запаволіць працэс асушэння нашага клімату.

**Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.**




## ДЛЯ ТАКСІСТА СЕМ ВЁРСТАЎ НЕ КРУК?

Мы, беларусы, з даўніх часоў імкнуліся да лепшага жыцця, шукалі яго, у тым ліку за межамі. Смялейшыя выязджалі ў Еўропу, Амерыку, Канаду, што ўжо казаць пра Карэлію, Казахстан і Далёкі Усход... А потым — хай не заўсёды — але вярталіся дамоў. Як той казаў, добра там, дзе нас нямашака.

Дык вось, гадоў пятнаццаць назад мая знаёмая ў Германію падалася, да мужа, які з'ехаў яшчэ раней і ўжо паспеў нейкі час папрацаваць там, купіць кватэру, абсталяваць да прыезду сям'і, на першы час назапасіць грошай...

А гэта азначала адно: яго любай жоначцы на новым месцы не трэба будзе тэрмінова шукаць работу (найчасцей — незалежна ад адукацыі — пасудамыйкай ці «нянькай» пры старых). Яна змажа спакойна агледзецца, пажыць для сябе і сваёй сям'і, якая ўрэшце з'ядналася, парадавацца...

Што было, тое было, але ж досыць хутка сплыло, бо засумавала Наташа: муж цэлымі днямі на рабоце, бо трэба ж старацца, забяспечваць сям'ю, дзеці — у школе. Ёй, беднай, ні пагаварыць з кім-небудзь, ні выйсці куды... Мовы ж не ведае, горад чужы — там і заблудзіцца можна.

Хоць-нехаць прыйшлося запісацца на моўныя курсы. Муж на першыя заняткі яе завязіў. У другі раз, каб з'ездзіць, надумала таксі заказаць, балазе — у тэлефоне нумарок пазначаны. Яна лічбачкі тыц-тыц-тыц — хуценька набрала, вуха настаўрыла, каб вось пачуць іхняе «Хелло!», а ёй — і проста ў сэрца, можна сказаць — далятае наша «А-алё!».

— Вы рускі?! — пытае жанчына з той радасці:

— Не, беларус, — чуе ў адказ.

— Праўда?! Няўжо?! — ажно свеціцца Наташа. — І даўно тут жывяце?

— Ды 34 гады... З хвосцікам...

— І сям'я з вамі?!

— А як жа. Вядома, са мной! Дзе ж яшчэ ёй быць...

Што яшчэ спытаць, маладзіца не ведае, а пагаварыць — проста жах як хочацца!

Суайчыннік «выручыў» — праз паўзу спытаў:

— Дык адкуль вас забраць? Адрас назавіце.

Кліентка тут жа:

— Прагерстрасэ, трыццаць...

— Далекавата, аднак, — перапыніў таксіст. — Гэта ж недзе ў Германіі?

— Так, у Дрэздэне... А вы дзе?

— А я ў Смаргоні.

— Вой, дык мы ж землякі! — яшчэ больш узрадавалася жанчынка. І толькі тут да яе дайшло, што нумар, які толькі што набрала, запісала сабе куды раней, яшчэ ў Беларусі, і што хвіліна міжнароднай размовы можа выліцца ў такую капеечку...

І сапраўды: тэлефон падказаў, што на балансе ў яе нуль еўра. Гэта значыць, што да прыезду мужа пазваніць куды-небудзь яна не зможа, на курсы трапіць таксама... Усяго і радасці, што з землячком пагаманіла, душу адвяла.

...Даўнавата, як бачыцца, тое было. За гады Наташа добра засвоіла мову, знайшла сабе цікавую работу, ва ўніверсітэце вучыць моладзь — усё ў іх як мае быць!

Але тая размова з таксістам нене ды і ўспомніцца... Разам з сумным «адкрыццём»: мову абранай краіны трэба вучыць раней — да таго, як з'язджаць. Тады менш будзе сюрпрызаў.

**Любоў Чыгрынава,**
*г. Мінск.*

## ЧУЖУЮ БЯДУ І Я РАЗВЯДУ...

### Са сваёй што рабіць?

*...Цётку Маню з вёскі ў горад*
*Перавезлі ўвосень дзеці,*
*«На замку» дзянёк каторы,*
*Сумна беднае кабеце!*
*Тэлевізар не глядзіцца,*
*Вочкі стомлены чытаць...*
*У суседзяў ціха быццам —*
*Не чуваць іх, не відаць...*
*Раптам во — званок у дзверы!*
*Будзе з кім пагаварыць?!*
*Аж забылася праверыць,*
*Каму дзверы адчыніць...*
*Увайшоў такі мужчына —*
*Пры партфелі, пры вусах:*
*— Маё прозвішча — Вяршынаў,*
*Прадстаўляю «Абдурстрах»...*
*Што за «страх», гадае Маня.*
*Не было б якой бяды?!*
*Не казалі ж дзеці з рання,*
*Што ён з'явіцца сюды.*
*А той зух ужо з паперкай*
*І салодка так пяе:*
*— Мне вы можаце паверыць,*
*Вось дакументы мае.*
*Вас, жанчынка, застрахую*
*Ад навалы — як такой...*
*Калі што — бяду любую*
*Развяду адной рукой!*
*Захварэеце — на лекі*
*Грошай выпішам крыху.*
*Нам удзячны і калекі,*
*Кажуць: зноўку застрахую!*
*Калі маеце машыну,*
*Дык падкінем на рамонт:*
*Будзе бегаць, як дзяўчына*
*За хлапцамі наўздагон!*
*Вельмі файная кватэра...*
*А пажар, крый бог, патоп?*
*Ці зладзюга ўзломіць дзверы*
*Альбо зробіць дзе падкоп?..*
*Наша фірма дапаможа,*
*Не пакіне у бядзе!*
*Мы яшчэ й не тое можам*
*Дзеля шчасцейка людзей!*
*Скажам, мае ўнук ваш бізнес*
*У далярах, за мяжой.*
*Мы — любых пазбавім рызык!*
*Гарантуем вам спакой...*
*Красамоўнічаў Вяршынаў,*
*Пра паслугі гаварыў...*
*Моўчкі слухала жанчына:*
*Як Амерыку адкрыў!*
*А пасля пытае ціха*
*Ды з хітрынкай у вачах:*
*— А ці мог бы кляты вірус*
*Адагнаць ваш «Абдурстрах»?*
*Ці дасць рады для дачушкі*
*Мужа добрага знайсці:*
*Той, што быў, распіўся дужа:*
*Не шанцуе па жыцці...*
*Калі ў гэтым дапаможа*
*«Страх» ваш...*
*Хоць па драбязе,*
*Падпішуся з ласкай божай*
*На паслугі вашы ўсе!*
*...Сціх тут «пасвіст салаўіны»,*
*«Госцік» рушыў за парог.*
*Стуль і вымавіў Вяршынаў:*
*— Няхай вам паможа бог!*

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*

## ГАРБУЗЫ — ГЭТА АДНО, кавуны — другое...

З Растова ў Мінск мяне перавёз мой будучы муж. Ніколі не забыцца, як ехалі сюды ўпершыню, як па дарозе Раман (яшчэ студэнт філфака) знаёміў мяне са сваёй краінай і роднай для яго беларускай мовай. Казаў, напрыклад, што едзем чыгункай: адно слова, а не жалезной дарогай (у рускай — два), што ў цягніку (ад слова «цягнуць»)...

Потым мы ішлі з ім па праспекце знакамітага Скарыны, дзе мяне ўражвала ўсё: Галоўпаштамт, карціны ў мастацкім салоне, кнігарня (а не книжный магазин)... Што ўжо казаць пра цукерню (я ахрысціла так сталічную «Лакомку», пачуўшы слова «цукерка»)...

Факт, што ў першы ж прыезд, злёту, я засвоіла многае.

Праўда, і загадак хапіла. Помню, ніяк не магла разабрацца, што такое канапа, а што — дыван, што — ложка, што — ложак, чаму тыква па-беларуску гарбуз, а арбуз — ужо кавун?

Вось гэта, апошняе, я не запомніла б, мусіць, ніколі, але...

Назаўтра пасля прыезду мы з Раманам пайшлі гуляць, пад вечар пасядзелі ў кафэ, а непадалёк ад яго купілі арбуз (гэта значыць, кавун). Не магу сказаць, што ён дужа вялікі быў, але чамусьці вельмі цяжкі. Ды і неслі яго без «торбы»... Мы змарыліся і нарагаталіся, пакуль «дакацілі» яго дадому. А ўжо там — захацелі пакаштаваць, пачаставаць бацькоў.

Усе разам паселі за стол, адрэзалі па лустачцы. Дзе была адна, там і дзве, і тры, і чатыры... Ды яшчэ за размовай... Факт, што спыніцца мы не змаглі і проста не заўважылі, як з'елі ўвесь.

Нанач разышліся па пакоях: гаспадары — у адзін, Раман — у другі, я — на ложак у трэцім... Там яшчэ фарбай пахла. Гаспадар на балконе рамонт распачаў. (Я, трохі мастачка, абяцала яму дапамагчы — пафарбаваць рамы.)

Толькі прылягла, — чую, што трэба ўставаць, ісці ў прыбіральню.

Там — праз шчылінкі бачу — святло. Значыць, нехта мяне апярэдзіў?

Я затаілася ў сваім пакоі, стала чакаць: хвіліну, дзве... Больш — проста не змагла: выйшла на балкон, узяла там пустую бляшанку ад фарбы... Потым, з ёй жа, рушыла ў бок прыбіральні...

Здалёк убачыла (калідор вялікі, начнік гарыць), што святла там ужо няма — на шчасце.

А няшчасце заключалася ў тым, што... расчыніліся дзверы спальні, і насустрач мне выйшаў гаспадар.

Я (у халаціку паверх «начнушкі») не ведала, дзе і падзецца!... Ён таксама не чакаў мяне ўбачыць... Ды яшчэ з бляшанкай у руках. «Ты што, — здзівіўся, — фарбаваць узялася?.. З глузду з'ехала, дзеўка!.. Ану, аддай мне фарбу!» — «Не!... Нізашто!» — ускрыкнула я, хаваючы бляшанку за спінай і адступаючы ў «свой» пакой.

Тым часам на галасы ўжо ішла гаспадыня. «Што за шум?» — спытала ў нас, але разбірацца не стала — зачынілася ў прыбіральні...

Карацей, мне зноў давялося ісці на балкон...

Вось такая, «на другие не похожая ночь у Любочки была». На працягу яе чаго ні прывялося: і нацярпецца, і назлавацца (нанач есці кавун — гэта ж галавы не меўшы!)... А нарэшце ўжо і нарагатацца, бо аказалася, што «вясёленькая» ноч была не толькі ў мяне — ва ўсёй маёй (ужо без сумненняў) новай сям'і.

Вось такім атрымалася першае і напраўду блізкае знаёмства з ёй, з бацькамі майго жаніха.

Як і з беларускай мовай, у якой гарбузы — гэта адно, а вось кавуны — ужо другое. Не трэба нанач іх есці шмат.

**Любоў Я.,**
*г. Мінск.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# Рота асабістай аховы

## Яна ёсць у кожнага. Трэба толькі памятаць

ГЭТЫМ разам перад тым, як ісці ў царкву, я склала свой немалы спіс загадзя. Каб не заблытацца ў Мікалаях і Уладзімірах — у мамінай вялікай праваслаўнай радні гэта спрадвеку надзвычай папулярныя імёны. А ў памінальную Дзімітраўскую суботу вельмі трэба, каб абавязкова згадалі кожнага. Нават тых, каго не ведала асабіста, але чые імёны застаюцца ў памяці як частка ўласнага радаводу...

З каталіцкай, бацькавай, раднёй крыху прасцей. На імшу за спачын можна падаваць не імёны, а прозвішчы сям'і. Вось і гэтым разам перад Усімі Святымі падала ў касцёл запіску, каб памаліліся за спачын усім вядомых мне і невядомых Ляўковічаў і Рэдзькаў. А ўжо ў Задушны дзень, другога лістапада, запаліўшы лампадку каля касцёла, згадала ў думках і бацьку, і дзядзьку Валодзю, і бабку Амілю, што мяне выгадавала, і расстралянага ў 37-м дзеда Вальку, і яго незамужнюю сястру Мальвіну, што дапамагала бабулі падымаць двух хлопцаў-бязбацькавічаў, і прадзедаў Тамаша і Адама, і прабабку Юзэфу, і прапрадзеда Івана, пра якога ведаю толькі таму, што ў Адама, памерлага ў 36-м, на помніку напісана імя па бацьку Іванавіч... Як звалі дзедаву маці, я не ведаю, і спытацца не было ў каго. Бабуля, адзіная са старэйшай радні, хто дажыў да маёй дарослаці, не магла ўспомніць, як імя свекрыві, казала толькі, што памерла тая задоўга да іх з дзедам вяселля ад «іспанкі»... Дзе дакладна пахаваныя палова родных людзей з гэтых зусім блізкіх да мяне пакаленняў, ніхто з нас, цяперашніх, не ведае. Тыповая гісторыя былога беларускага памежжа — Рыжскі мір дзяліў нашу зямлю па-жывому, і каму які клопат быў, што вёска застаецца ў адной дзяржаве, а могілкі, на якіх ляжыць уся радня гэтай вёскі, — у другой? Засталіся толькі імёны ды дзве пажаўцелыя фотакарткі, што цудам захаваліся з даваенных часоў.

АБ праваслаўных продках ведаю нашмат больш. Шмат паспела расказаць мама, некаторых памятаю сама. Амаль усе ляжаць на адных могілках — у Кукшавічах, што недалёка каля Станькава... Вось толькі падаваць запіску ў царкву няпроста. Трэба засяроджвацца і ледзь не на пальцах лічыць. Першы Уладзімір — гэта прадзед, яго прозвішча было Клімовіч, але ў вёсцы ўсе яго звалі Ганчар. Ведаю яго толькі па старым фота — зграбны дзядок у кажушку і ў шапцы, бы ў членаў палітбюро... Другі Уладзімір — мамін дзядзька. Ён памёр зусім маладым, у дваццаць сем гадоў, толькі тры гады пражыўшы пасля сумнавядомых выпрабаванняў на Тоцкім палігоне, дзе праходзіў службу. Мама згадвала, як ён, ужо хворы на лейкоз, ёй з братам, сваім не нашмат маладзейшым пляменнікам, загадваў па ім не плакаць і пражыць за яго тое, што ён не паспее. Яшчэ адзін Валодзя — той самы мамін брат. Лёс яго закінуў ва Украіну, прыязджаў ён да нас рэдка (працаваў на ваенным заводзе), вельмі сумаваў па радзіме. Мы з ім пісалі адно аднаму доўгія падрабязныя пісьмы, калі я аднойчы паспрабавала набраць свой допіс на камп'ютары, вельмі на мяне сварыўся: маўляў, не адчуваю тваёй душы. Чацвёрты Уладзімір — мамін стрыечны брат, вясёлы дзядзька Вова. Ён жыў у Дзяржынску каля аўтавакзала, і я студэнткай любіла забягаць у іх з цёткай Тамарай (яе імя я таксама пішу) утульны дом перакусіць на шляху дадому.

ДАЛЕЙ — Мікалаі. Мамін дзядзька, ветэран вайны, галава сямейства, дакладней, клана. Яго слухаліся ўсе, за ім было апошняе слова, у яго шукалі абароны, калі хто крыўдзіў... Дзядзька Коля, мамін малодшы брат, мой хросны, з якім заўсёды было весела і цікава. Коля, муж сястры, які так і застаўся саракадвухгадовым, якога і сёння лічу любімым братам... Два Васілі — іх таксама трэба не забыцца. Маміны родны бацька і айчым. Першы пайшоў на вайну і па маладосці (было крыху больш за дваццаць) вырашыў і застацца там, прынамсі для жонкі з дзецьмі, напісаўшы сам на сябе пахаронку. Другі ўзяў саламяную ўдаву з двума малымі дзецьмі, гадаваў як сваіх, ласкава называючы, а пасля і іх дзяцей, «мае тараняты»... Прапрабабуля Алеся (пішу як Аляксандра, хоць і не ведаю дакладна), якая, казалі, умела замаўляць травы і ваду. Яе дачка прабабка Серафіма, якая была на галаву вышэйшая за свайго мужа, прадзеда Кірыла (вось у каго, пэўна, мае сто восемдзясят). Іхняя дочкі — бабуля Надзея, яе сёстры Марыя і Вера. У кожнай быў свой пакрыўчасты жаночы лёс, які цяжка назваць шчаслівым. Вера, напрыклад, выскачыла замуж за татарына, які служыў у Станькаве, з'ехала з ім у яго роднае паселішча, нарадзіла сына, адмовілася прымаць іслам, муж узяў сабе яшчэ адну жонку, мясцовую. Ездзілі ратаваць яе за блізкі свет браты — Уладзімір і Мікалай... Дзве Людмілы — мая матуля і яе стрыечная сястра. Яны былі амаль равесніцы, і, каб не блытаць, маму ў сям'і нават ужо ў пажылым узросце пяшчотна звалі Люся...

ЧЫМ становішся старэйшым, тым даўжэйшы гэты спіс. Але, вы ведаеце, што дзіўна — язык не паварочваецца назваць яго жалобным. Гэта такая нябачная магутная рота тваёй асабістай аховы. Якая пастаянна побач з табой, пакуль жыве ў тваёй памяці, пакуль ты ведаеш яе пайменна. Якая нават у самы цяжкі час сведчыць: ты не адзін, у цябе ёсць заступнікі. Якая ў лістападаўскі вечар, калі запаліш свечку і ціхенька паклічаш: «Святыя Дзяды, просім вас, хадзіце, ляціце да нас!», абавязкова загляне ў твой дом, каб ахінуць яго моцным абярэгам ад усяго дрэннага... Я асабіста не тое што ў гэта веру — мне здаецца, я гэта нават дакладна ведаю.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества УП «Молодечноэлектромонтаж» ОАО «Будавник-169»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона с учетом НДС 20 %, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Вагон-дом, инв. № 00000872 | 588,00 | 58,80 | 29,40 |
| 2 | Гараж сборно-разборный, инв. № 00000804 | 1 092,00 | 109,20 | 54,60 |
| 3 | Вагон-бытовка, инв. № 00000943 | 1 020,00 | 102,00 | 51,00 |
| 4 | Измеритель тока короткого замыкания Щ41160, инв. № 00000811; компьютер «Логос» 5200 (2GB/320GB), инв. № 00000886; мобильный телефон LG; факс Panasonic KX-FT982; копир. аппарат XEROX 3117, инв. № 00000863; ноутбук Samsung, инв. № 00000893; телевизор «Витязь «Микра» (серый); Телевизор «Витязь» | 702,00 | 70,20 | 35,10 |
| 5 | Mitsubishu-Outlader, 2008 г. в., объем двигателя 2,4 л, коробка передач – автомат | 15 228,00 | 1 522,80 | 761,40 |

В отношении Лотов 1–4 проводятся первые торги. В отношении Лота 5 проводятся первые повторные торги. Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 184 (29553) от 24.09.2021, стр. 23

| | |
|---|---|
